

НЕВЯСЁЛАЯ ГІСТОРЫЯ ЧЫТАЧА 6

ПЯЦЬ АНКЕТ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА 19



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЛІСТАПАДА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 229 (29598)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TVПРАГРАМА

КОРАТКА

- БЧ прызначыла 67 дадатковых цягнікоў на час навагодніх і калядных свят.
- Каля 600 электразарадных станцый да канца года з'явіцца ў Беларусі.
- Нацбанк вызначыў патрабаванні да аператараў сэрвісаў анлайн-запазычання.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі:**

*«Бежанцы, якія воляй лёсу знаходзяцца на беларуска-польскай граніцы, маюць патрэбу ў дапамозе і падтрымцы. Сёння складваецца такая сітуацыя, што гэтыя людзі аказаліся нікому не патрэбнымі. Па сутнасці справы, да цяперашняга часу, нягледзячы на прыезд прадстаўнікоў міжнародных арганізацый, не прынятыя ніякія рашэнні. Вядома, мы працягваем аказваць ім дапамогу — у харчаванні, размяшчэнні, выдзяленні цёплай вопраткі, аказанні медыцынскай дапамогі. Мы не дзелім людзей на сваіх і чужых, і калі хтосьці мае патрэбу ў дапамозе, мы заўсёды будзем яе аказваць. Аднак тут патрэбныя ўжо і палітычныя рашэнні. Мы разумеем, што гэтае пытанне так не вырашыцца. Калі бежанцы захочуць вярнуцца на радзіму, мы гатовыя аказаць садзейнічанне. Аднак гэтыя людзі кажуць, што нацэлены паехаць туды, дзе знаходзяцца іх сваякі, куды іх запрашалі. Захаду ўжо час павярнуцца да вырашэння гэтай праблемы і ўрэгуляваць канфлікт».*

З першых вуснаў

# «Галоўнае — захаваць нашу дзяржаўнасць»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у сумесным пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі і рабочай групы па дапрацоўцы праекта Канстытуцыі. Ён падкрэсліў, што работа па падрыхтоўцы змен Канстытуцыі выйшла на фінішную прамую.**



Фота БелТА.

Разам з Канстытуцыйнай камісіяй над праектам Асноўнага Закона працавала спецыяльна створаная рабочая група. У склад Камісіі і групы ўвайшлі аўтарытэтныя эксперты, прафесіяналы ў розных галінах дзейнасці.

«Зроблена нямала. Адзначу, што Канстытуцыйная камісія ўнесла напрацаваныя прапановы, акумуляваўшы ў тым ліку шматлікія ініцыятывы грамадзян. Падрыхтаваны варыянт Канстытуцыі ўзяла за аснову рабочая група, якая засяродзіла сваю дзейнасць на шэрагу нявырашаных прынцыповых пытанняў, на найважнейшых канстытуцыйных нормах», — нагадаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што ў выніку такой работы ўдалося выпрацаваць найважнейшыя канстытуцыйныя нормы. Замацаваны статус Усебеларускага народнага сходу, пераразмеркаваны паўнамоцтвы паміж органамі дзяржаўнай улады, гарантавана стабільнасць дзяржаўнага апарату.

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу, што гэтае сумеснае пасяджэнне чарговае ў распрацоўцы змяненняў. Яно не падводзіць рысу пад работай над змяненнямі ў Асноўны Закон. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што не ва ўсім меркаванні Камісіі і рабочай групы супадалі. Але, па яго словах, гэта абсалютна нармальна, паколькі ў спрэчках нараджаецца ісціна. І таму прапановы Канстытуцыйнай камісіі атрымалі сваё развіццё пасля адпаведнай дапрацоўкі. Некалькі разоў кіраўнік дзяржавы сустракаўся з рабочай групай. «Трэба было абгаварыць адчувальныя пытанні. Бо вынікі нашай работы вызначаць, якой будзе наша краіна ў будучыні», — сказаў ён.

### УНС ПРОСТА ПРОСІЦЦА Ў КАНСТЫТУЦЫЮ

Прэзідэнт канстатаваў, што самыя галоўныя змены Асноўнага Закона накіраваны на значнае ўмацаванне інстытута народаўладдзя.

«Менавіта ў гэтых мэтах і задумвалася канстытуцыйнае замацаванне статусу УНС, надзяленне яго стратэгічна важнымі для стабільнасці краіны паўнамоцтвамі. Як я не аднойчы казаў, УНС — гэта наша веча. Лічу, што дадзены Інстытут народаўладдзя адпавядае векавому нацыянальнаму ўкладу жыцця беларусаў. Апошнія падзеі пераканалі беларускі народ, што нам не варта пераймаць нормы, прынцыпы і лад жыцця там (на Захадзе. — **Заўв. аўт.**). Вы бачылі, што дэкларуецца адно, прапіхваецца нам другое, а робяць яны... Як робяць, вы гэта бачылі», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Усебеларускі народны сход з'явіўся даўно і адыграў сваю значную ролю. Па яго словах, гэта не новы орган. І сёння ён проста просіцца ў Канстытуцыю.

«І тут справа не ў асобах. Асабліва падкрэсліваю: ніякіх канкрэтных асоб у Канстытуцыі быць не павінна. Ніякай Канстытуцыі Лукашэнка пад сябе не робіць», — канстатаваў кіраўнік краіны.

СТАР. 2

Карысны вопыт

# «ПЕРШЫ БЛІН» НЕ КОМАМ

## Рэцэпт ад навабранцаў Мазыршчыны



Малады спецыяліст СШ № 11 г. Мазыра — настаўніца гісторыі і грамадазнаўства Юлія КАВАЛЕНКА.

**Каля 400 маладых спецыялістаў на першыя працоўныя месцы сёлета прынялі калектывы Мазырскага раёна. Сваю кар'еру тут пачалі будаваць амаль 160 выпускнікоў ВНУ і звыш 230 — устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Прынамсі, Мазыршчына з году ў год вылучаецца высокай доляй моладзі, якая застаецца працаваць пасля адпрацоўкі размеркавання — 75,4 %.**

### ПАСВЯЧЭННЕ АД КІРАЎНІКА РАЁНА

Маладое папаўненне ў святочнай атмасферы віталі на традыцыйнай сустрэчы з кіраўніцтвам райвыканкама. Для першых гэта магчымасць даведацца аб перспектывах дзяржаўнай палітыкі па падтрымцы сем'яў, гарантыях працаўладкавання і аказання адраснай дапамогі. На падобных восеньскіх сустрэчах моладзь актыўна цікавіцца і развіццём спорту, турызму, у цэлым сістэмай адукацыі ў раёне.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы



# «Галоўнае — захаваць нашу дзяржаўнасць»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ДЗЕЦЯМ НЕАБХОДНА ПАКІНУЦЬ НАРМАЛЬНУЮ КРАІНУ

Пры гэтым Беларусь застанецца прэзідэнцкай рэспублікай. «Такім чынам мы абаронім асновы дзяржаўнасці. Захаваем і замацуем пераемнасць свайго гістарычнага досведу, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Давайце будзем шчырыя. Усё будзе залежаць ад таго, які прэзідэнт прыйдзе на змену гэтаму. Таму мы і падстрахоўваемся Усебеларускім народным сходам».

Па словах кіраўніка дзяржавы, многае будзе залежыць ад асоб і ў тым ліку ад першай асобы дзяржавы, не перабольшваючы ролю ў гісторыі. «Мы стварылі сваю суверэнную незалежную дзяржаву, якая праіснавала больш за чвэрць стагоддзя. Але для дзяцей трэба пакінуць нармальную краіну. Сёння трэба пераканаць людзей, кожнага пераканаць, што цяпер галоўнае не асабістае, а галоўнае для нашага грамадства — захаваць дзяржаўнасць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## ТРЭБА ПРАЯЎЛЯЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў найбліжэйшы час падрыхтаваны праект Асноўнага Закона будзе вынесены на ўсенароднае абмеркаванне. На гэтым этапе кожны грамадзянін зможа стаць удзельнікам канстытуцыйнага працэсу.

«Думаю, што членам Канстытуцыйнай камісіі і рабочай групы варта данесці да насельніцтва значэнне прапанаваных канстытуцыйных навацый. Сацыялагічныя даследаванні сведчаць, што ўжо 55—60 працэнтаў насельніцтва гатовы прыйсці на выбары і падтрымаць праект Канстытуцыі, прычым не бачачы яго, а атрымліваючы інфармацыю па асобных момантах. Калі мы добра папрацуем і апублікуем гэты праект, раскажам пра навацыі, навошта мы прымаем Канстытуцыю, то я ўпэўнены, што людзі нас падтрымаюць, як гэта было ў сярэдзіне 90-х», — заўважыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы параіў сустракацца з людзьмі — у працоўных калектывах, па месцы жыхарства, у грамадскіх аб'яднаннях, выступаць у СМІ, расказваць аб Канстытуцыі. Адным словам — праяўляць ініцыятыву.

«Павінен вас папярэдзіць, што тыя, хто больш за ўсё крычаў аб пераменах, сёння закрычалі, што не патрэбная новая Канстытуцыя», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, што яму вядома аб плане, які распрацавалі збеглыя працïўнікі ўлады, і паабяцаў паказаць усім, чаго яны хочуць. «Гэта пасмешышча поўнае. Гэты план збеглых, там, за мяжой, каб атрымаць фінансаванне, інакш не скажаш, проста смешны. Я чытаю і думаю: няўжо Захад адурэе і дасць на гэта грошы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт падкрэсліў, што яны рыхтуюцца зламаць Канстытуцыю і зноў вывесці людзей на вуліцу, калі атрымаецца, адзначыўшы, што гісторыя нічому не вучыць.

Паводле слоў Прэзідэнта, на рэферэндум грамадзяне павінны прыйсці з выразным разуменнем сутнасці ўсіх новаўвядзенняў і неабходнасці іх прыняцця.

• **Каментарый у тэму**

### Далейшы крок у развіцці народаўладдзя

Пасля пасяджэння **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА** расказаў журналістам, як ідзе работа над змяненнямі ў Канстытуцыю.

«Сённяшняе сумеснае пасяджэнне паказала, што ў цэлым падрыхтаваны для абмеркавання праект адобраны. Аб гэтым казалі многія выступоўцы. Яны каментавалі тыя ці іншыя артыкулы Канстытуцыі. Прагучалі сумненні ў дакладнасці карэкціровак да асобных канкрэтных артыкулаў, у прыватнасці па парадку абрання дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Па іншых артыкулах былі выказаны ўдакладняльныя меркаванні. Працэс творчы, і мы ўжо амаль выйшлі на фінішную прамую і пастараемся не скараціць», — заявіў ён.

Па словах Ігара Сергеенкі, праект адноўленай Канстытуцыі — гэта далейшы крок на шляху развіцця народаўладдзя ў краіне. Паводле яго слоў, многія артыкулы сацыяльнага блока атрымалі далейшае развіццё, паколькі дзяржава не адыходзіць ад сацыяльнай накіраванасці сваёй дзейнасці. «Разам з тым уводзіцца сацыяльная адказнасць грамадзян перад грамадствам і перад дзяржавай за свае дзеянні. Гэта натуральна. Гэта працэс двухбаковы», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Сергеенка расказаў, што ў праекце далейшае развіццё атрымалі дзяржаўныя інстытуты — парламент, урад, пытанні, якія датычацца паўнамоцтваў Прэзідэнта. «І, адпаведна, новая глава, сёння гэтаму было прысвечана дастаткова шмат увагі, — гэта Усебеларускі народны сход — найвышэйшы прадстаўнічы орган. Гэта далейшае развіццё народаўладдзя», — акцэнтаваў увагу ён.

### Канстытуцыя жыве ў законах

**Старшыня Канстытуцыйнага Суда і Канстытуцыйнай камісіі Пётр МІКЛАШЭВІЧ** падкрэсліў, што дзейнасць Канстытуцыйнай камісіі не спынілася. Яна будзе завершана, калі змены ў Канстытуцыю вынесуць на рэферэндум.

«Я павінен адзначыць, што Канстытуцыя — гэта грамадскі дагавор аб уладкаванні грамадства ў дзяржаве, аб сістэме ўлады. І таму сёння ўся работа вядзецца ў тым напрамку, каб усе грамадзяне актыўна ўдзельнічалі ва ўнясенні змяненняў у Канстытуцыю нашай краіны. Таму, калі праводзілі пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі, мы ўсебакова вывучалі прапановы грамадзян, іх акумулявалі і на іх аснове выпрацавалі пэўныя прапановы па змяненні канстытуцыйных палажэнняў», — сказаў ён.

Пётр Міклашэвіч адзначыў, што змяненні закранулі ўсе раздзелы Канстытуцыі, у тым ліку і прэамбулу. Паводле яго слоў, падчас усенароднага абмеркавання дапрацаванага праекта грамадзяне змогуць як азнаёміцца з прапанаванымі новаўвядзеннямі, так і ўнесці іншыя магчымыя прапановы. А карэкціроўкі па тэксце Канстытуцыі будуць рабіцца і пасля народнага абмеркавання.

«І камісія бачыць сваёй найважнейшай задачай, каб у працэсе ўсенароднага абмеркавання растлумачваць сутнасць змяненняў. Нормы Канстытуцыі маюць абагульнены характар, а канкрэтызацыя развіваецца ў законах. Ёсць класічны выраз: Канстытуцыя жыве ў законах. І мы часам бачым, што грамадзяне прапануюць у нашым Асноўным Законе дэталёва канкрэтызаваць тыя ці іншыя грамадскія адносіны, што практычна немагчыма. І цяпер наша задача — чуць грамадзян і даваць пэўныя тлумачэнні змяненняў, якія мы прапануем у Асноўны Закон», — расказаў Пётр Міклашэвіч.

Старшыня Канстытуцыйнай камісіі звярнуў увагу, што ў выпадку прыняцця абноўленага варыянта Канстытуцыі парламент чакае вялікая работа па прывядзенні заканадаўства ў адпаведнасць са змяненнямі, якія ўнясуцца ў Асноўны Закон.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Акцэнты

## Разам супраць санкцый і ўмяшання ва ўнутраныя справы

**Дзяржавам — членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва мэтазгодна ўзгоднена выступаць супраць санкцый і ўмяшання ва ўнутраныя справы іншых краін з боку Захаду. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА падчас пасяджэння Савета кіраўнікоў урадаў дзяржаў — членаў ШАС, якое прайшло ў рэжыме відэаканферэнцыі, паведаміла БелТА.**

Раман Галоўчанка адзначыў, што Беларусь падзяляе падыходы ШАС па процідзеянні пратэкцыянізму і гандлёвых войнаў, якія тармозяць сусветнае развіццё. «За лозунгамі нашых заходніх партнёраў аб неабходнасці барацьбы з аўтакратыяй, пашырэння ліберальна-дэмакратычных каштоўнасцяў, па сутнасці, стаіць старое каланіяльнае мысленне. Яно адлюстроўвае імкненне да выцяснення канкурэнтаў з прэміяльных рынкаў, ігнараванне гістарычных і нацыянальных асаблівасцяў іншых дзяржаў і халодны геапалітычны разлік, нацэлены на захаванне палітычнага і эканамічнага дамінавання Захаду», — сказаў ён.

«Сёння супраць Беларусі развязана поўнамаштабная гібрыдная вайна па ўсіх напрамках. Заходнімі краінамі ўведзены чатыры пакеты санкцый, у тым ліку эканамічнага характару, абмяркоўваюцца і далейшыя абмежаванні, падставай для якіх гэтым разам стаў справакаваны самім жа Еўрасаюзам міграцыйны крызіс на граніцы Беларусі і ЕС. Мэта дзеянняў нашых апанентаў відавочная: не пусціць у Еўропу мігрантаў і бежанцаў, якія сталі ахвярамі згубнай палітыкі па бяздумным насаджэнні так званай дэмакратыі, якая прывяла да ўнутрыпалітычных і міжэтнічных канфліктаў, разбурэння эканомікі і сацыяльнай інфраструктуры некалі стабільных дзяржаў, выкачванні іх прыродных рэсурсаў», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Ён звярнуў увагу, што такімі падыходамі ў тым ці іншым выглядзе сутыкаецца таксама і шэраг іншых краін ШАС. «Для процістаяння гэтым негатыўным з'явам усёй сям'і ШАС у міжнародных адносінах мэтазгодна ўзгоднена выступаць супраць любых праяў дыктату, аднабаковых абмежавальных мер і ўмяшання ва ўнутраныя справы іншых краін пад выглядам забеспячэння дэмакратыі і правоў чалавека», — рэзюмаваў Раман Галоўчанка. Па яго меркаванні, наспела неабходнасць падрыхтоўкі дагавора аб супрацоўніцтве і ўзаемаразуменні паміж Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва і АДКБ.

# Улада — на сувязі

**У гэтую суботу, 27 лістапада, у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме адбудуцца традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі.**

**З 9.00 да 12.00 на сувязі з грамадзянамі будуць:**

• ЗАЙЧУК Валянцін Міхайлавіч, першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама: 8016 22 13 121;

• ЯФРЭМАЎ Барыс Сяргеевіч, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама: 8021 22 22 222;

• ПРЫВАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч, намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама: 8023 23 31 237;

• КУРМАН Іван Іванавіч, кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама: 8015 27 35 644;

• ДЗЯДКОЎ Мікалай Леанідавіч, кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама: 8022 25 01 869;

• КУРЛЕНКА Дзяніс Мікалаевіч, намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама: 8017 50 04 160;

• КУХАРАЎ Уладзімір Яўгенавіч, старшыня Мінгарвыканкама: 8017 22 24 444.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Падчас аварыі на шахце ў Кузбасе загінула звыш 10 чалавек



Учора раніцай у Кемераўскай вобласці ў горадзе Бялова на шахце «Лісцвяжная» адбылося задымленне на глыбіні 250 метраў. На момант аварыі ў шахце знаходзіліся 285 горнарабочых. Паводле апошніх звестак, загінулі 11 чалавек, больш чым 40 чалавек пацярпела. СМІ паведамлялі, што на «Лісцвяжнай» мог адбыцца выбух. Прычынай задымлення, па версіі крыніцы ТАСС у экстранных службах, стала ўзгаранне вугальнага пылу ў вентыляцыйнай шахце. «Пасля гэтага дым па вентыляцыі распаўсюдзіўся па ўсёй шахце», — сказаў сураззмоўнік агенцтва. Паводле інфармацыі крыніц «Інтэрфакса», асноўная версія — парушэнне тэхнікі бяспекі. Аднак, адзначыў ён, ёсць і іншыя версіі, у тым ліку кароткае замыканне з-за няспраўнасці абсталявання і «прыродныя прычыны».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну ў сувязі з трагедыяй на шахце ў Кемераўскай вобласці, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

### Джонсан прыгразіў Макрону войскамі з-за нелегальных бежанцаў у Ла-Маншы



Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Барыс Джонсан склікаў экстранную нараду пасля гібелі 31 бежанца, якія спрабавалі на лодцы пераплысці Ла-Манш. Палітык звярнуўся да французскага прэзідэнта Эмануэля Макрона і прыгразіў накіраваць у краіну брытанскія войскі. Па словах прэм'ера, калі французскім уладам не пад сілу кантраляваць патокі нелегальных мігрантаў, то Злучанае Каралеўства гатовае задзейнічаць свае вайсковыя падраздзяленні. «Мы выкарыстоўваем усе сілы, якія можам! Мы не пакінем каменя на камені і разбурым бізнес гандляроў людзьмі і гангстараў», — заявіў Барыс Джонсан. Брытанскі прэм'ер і прэзідэнт Францыі ў ходзе перагавораў прыйшлі да сумеснай высновы аб неабходнасці тэрміновых мер для спынення нелегальнай перавозкі бежанцаў. Пры гэтым палітыкі сышліся на думцы, што ім спатрэбіцца дапамога Бельгіі і Нідэрландаў.

### Прэм'ер Швецыі пайшла ў адстаўку праз некалькі гадзін пасля абрання

Першая жанчына — прэм'ер-міністр Швецыі Магдалена Андэрсан падала ў адстаўку праз некалькі гадзін пасля абрання з-за выхаду партыі «зялёных» з кааліцыі. Аб гэтым паведаміла Associated Press. «Я не хачу ўзначальваць урад, у якім могуць быць падставы для сумненняў у яго легітымнасці», — заявіла Андэрсан на прэс-канферэнцыі. Яна паведаміла спікеру парламента Андрэасу Норлену, што ў далейшым будзе гатовая ўзначаліць аднапартыйны ўрад, у якім будзе прадстаўлена толькі яе Сацыял-дэмакратычная рабочая партыя. Норлен пацвердзіў адстаўку прэм'ер-міністра і заявіў, што звяжацца з лідарамі іншых партый, каб абмеркаваць сітуацыю, якая склалася.

# ЗЛАЧЫНСТВА СУПРАЦЬ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ

## Такая ацэнка дзеянняў польскіх улад

**Сучасны свет знаходзіцца на стадыі пастаяннай трансфармацыі, выкліканай крызісам светапарадку, яго інстытутаў і арганізацый, а міжнародная сацыяльна-палітычная абстаноўка характарызуецца з'яўленнем новых выклікаў і пагроз, абвастрэннем канфліктаў і супярэчнасцяў, якія ўяўляюць сур'ёзную небяспеку на нацыянальным і глабальным узроўнях. Гэта адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў прывітанні ўдзельнікам IX Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Бяспека ва ўмовах трансфармацыі пагроз: актуальныя праблемы і рашэнні». «Кіруемы звонку хаос распаўсюджваецца шляхам «каляровых рэвалюцый», гібрыдных войнаў і інфармацыйнай агрэсіі. Процістаяць гэтаму магчыма толькі пры ўмове кансалідацыі намаганняў, выпрацоўкі адзіных падыходаў да абароны нацыянальных і рэгіянальных інтарэсаў», — падкрэсліў беларускі лідар.**

### ГІБРЫДНЫЯ ВОЙНЫ, КІБЕРПАГРОЗЫ, ТЭРАРЫЗМ

Міжнародная архітэктура бяспекі разбураецца на вачах, заявіў дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч. Ён узяў удзел у IX Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі па праблемах гарантавання нацыянальнай бяспекі «Бяспека ва ўмовах трансфармацыі пагроз: актуальныя праблемы і рашэнні», перадае карэспандэнт БелТА. Маштабнае мерапрыемства праводзіць інстытут нацыянальнай бяспекі Беларусі сумесна з Камітэтам дзяржаўнай бяспекі, канферэнцыя прымеркавана да 75-годдзя інстытута.

«Сёння мы сутыкаемся з новымі рызыкамі і выклікамі ў сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Рэаліі цяперашняга часу такія: першае, што прыходзіць, — гэта гібрыдныя войны, кіберпагрозы, пытанні, звязаныя з біялагічнай небяспекай, ваенныя канфлікты, міжнародны тэрарызм, выкарыстанне штучнага інтэлекту ў злачынных мэтах. Гэтыя і іншыя пагрозы ўздзейнічаюць на ўсе дзяржавы, і з імі даводзіцца змагацца, выпрацоўваць эфектыўныя рашэнні. Гэтым пытанням прысвечана навукова-практычная канферэнцыя. Акрамя таго, міжнародная архітэктура бяспекі сёння разбураецца на вачах. У арсенал сродкаў націску ўваходзяць такія метады, як палітычныя, эканамічныя санкцыі, ваенная актыўнасць на тэрыторыях сумежных дзяржаў. Беларусь, на жаль, таксама зведвае на сабе ўвесь арсенал гэтых сродкаў націску. Тое, што адбываецца на сумежных тэрыторыях, не можа не выклікаць неспакой. Гэта нарошчванне актыўнасці блока НАТА, павелічэнне колькасці вучэнняў», — сказаў Аляксандр Вальфовіч.

За мінулы год больш чым 50 значных вучэнняў прайшло на тэрыторыі сумежных дзяржаў, у тым ліку каля граніц Рэспублікі Беларусь. «Сёння праходзіць пяць вучэнняў на тэрыторыях Польшчы і Латвіі. Групоўка войскаў, якая ў іх задзейнічана, перавышае 14 тысяч чалавек. Многа гэта ці мала? Напэўна, дастаткова для таго, каб развязаць нейкі пагранічны канфлікт або справакаваць сумежную краіну для прыняцця адэкватных мер рэагавання. Зыходзячы з гэтага, утрыманне ў пастаяннай баявой гатоўнасці не толькі Узброеных Сіл, а наогул усіх сіл і сродкаў сістэмы нацыянальнай бяспекі з'яўляецца найважнейшым фактарам. Напэўна, таму гэтыя пытанні знаходзяцца на пастаянным кантролі Прэзідэнта краіны, галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі. Удзяляецца вялікая ўвага будаўніцтву і развіццю Узброеных Сіл як ядру ваеннай арганізацыі дзяржавы. Ажыццяўляецца набыццё новых самалётаў, верталётаў, браніраваных аўтамабіляў, рэактыўных сістэм залпавага агню, сродкаў назірання, прыцэльвання, аўтаматызаваных сістэм кіравання войскамі. На кантролі ў Прэзідэнта знаходзяцца і пытанні падрыхтоўкі асабовага складу, праводзім адпаведныя камандна-штабныя вучэнні, — адзначыў дзяржсакратар. — Іншы важны вектар, які будзе разглядацца, у тым ліку на канферэнцыі, — ваенна-палітычны. Для нас гэта СНД, АДКБ, узаемадзеянне і супрацоўніцтва з нашымі стратэгічнымі партнёрамі. Акрамя Расійскай Федэрацыі, гэта Кітайская Народная Рэспубліка. Толькі разам можна выпрацаваць комплекс мер, якія дадуць магчымасць рэагаваць на пералічаныя пагрозы».

### КОРАНЬ ЗЛА

Беларусь не вінавата ў тым, што сёння адбываецца на беларуска-польскай граніцы, заўважыў Аляксандр Вальфовіч. «Тут трэба разглядаць корань зла і прычыны, якія справакаваў той жа калектыўны Захад у краінах Блізкага Усходу, Азіі», — перакананы дзяржаўны сакратар Савета бяспекі.

Паводле яго слоў, Беларусь процідзейнічае нелегальнай міграцыі. «Толькі за гэты год у нас затрымана звыш 11,5 тысячы нелегальных мігрантаў. Каля пяці тысяч адпраўлены за межы краіны і прыцягнуты да розных відаў адказнасці. Таму мы процідзейнічаем гэтаму, — адзначыў дзяржсакратар. — І органы пагранічнай службы сёння нясуць службу ва ўзмоцненым рэжыме. Мы маглі б, вядома, гэтак жа зрабіць, як нашы заходнія суседзі, прыцягнуць туды Узброеныя Сілы, нейкія іншыя групоўкі. Але зразумейце, сапраўды, можа ўспыхнуць пагранічны інцыдэнт. Таму мудрае рашэнне — кіраўнік дзяржавы сёння не даў каманды разгарнуць нейкія групоўкі войскаў, хоць яны знаходзяцца ў нас у пастаяннай боегатоўнасці паблізу граніц Рэспублікі Беларусь. Абарона дзяржаўнай граніцы ажыццяўляецца органамі пагранічнай службы сёння ва ўзмоцненым рэжыме, зыходзячы з гэтага патоку мігрантаў і прыняцця адпаведных мер», — адзначыў дзяржсакратар.




Фота БелТА.

**Бежанцы, якія знаходзяцца ў транспартна-лагістычным цэнтры каля беларуска-польскай граніцы, правялі мітынг з патрабаваннямі прапусціць іх у Еўропу і не вяртаць у Курдыстан.**

### ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ПРАВАКАЦЫЯ

Уся гісторыя з міграцыйным крызісам — класічная заходняя інфармацыйная правакацыя. Аб гэтым заявіў прафесар МДУ імя М. В. Ламаносава палітолаг Андрэй Манойла. «Наогул, гэта аперацыя заходніх спецслужбаў. Дарэчы, не польскіх, палякі там працуюць у якасці выканаўцы. Гэта тыповая аперацыя амерыканскай разведкі, якая выкарыстоўвае палякаў для работы пад чужым сцягам, ёсць такі тэрмін, — сказаў Андрэй Манойла. — Гэта звычайная правакацыя, каб стварыць інцыдэнт, які дазволіў бы абвінаваціць Беларусь і яе кіраўніцтва ў правядзенні агрэсіўнай палітыкі. Гэты інцыдэнт быў створаны. Ён пэўным чынам пачаў асвятляцца. Адпаведна польскія ўлады правакавалі, каб нервова паводзілі сябе мігранты, якія спрабавалі прарвацца праз граніцу, іх сустракалі вадамётамі і труцілі слёзатачывым газам, але гэтыя моманты не здымалі, а здымалі выключна агрэсіўнасць мігрантаў і казалі, што іх штурхае нехта ззаду, што рускія і беларусы гэта ўсё арганізавалі».

Польшча ў сітуацыі з бежанцамі паказала сваю крывадушнасць, перакананa старшыня Навукова-кансультатыўнага савета пры Антытэрарыстычным цэнтры дзяржаў — удзельніц СНД доктар юрыдычных навук Мар'яна Качубей. «Беларуская пазіцыя абсалютна бездакорная з прававога пункту гледжання. Ніводнай нормы права парушана не было, а тое, што сумежная дзяржава паказала сябе бясконца крывадушным суб'ектам, гэта факт. Паслухайце, бо не Беларусь бамбіла тэрыторыі тых дзяржаў, адкуль прыйшлі гэтыя людзі. Калі Польшча пасылала свой кантынгент у НАТА, ну і прыміце гэтыя дзве тысячы чалавек. Гэта было б справядліва», — лічыць Мар'яна Качубей.

### У КРЫВАВАЙ ПАСТЦЫ

Сітуацыя з бежанцамі на польскай граніцы кваліфікуецца як злачынства супраць чалавечнасці. Аб гэтым заявіла легенда польскай «Салідарнасці», былая падпольшчыца Данута Куронь, паведаміла Gazeta Wyborcza. Паводле яе слоў, выканаўцамі палітыкі польскай дзяржавы ў адносінах да бежанцаў з'яўляюцца афіцэры пагранічнай службы. Іх падтрымліваюць розныя фарміраванні Войска Польскага, паліцэйскія фарміраванні, а таксама тыя жыхары прыгранічных тэрыторый, якія пайшлі на супрацоўніцтва з уладамі.

«Мы можам многае даведацца аб ахвярах канфлікту, калі захочам. У СМІ з'яўляюцца паведамленні пра людзей, якія ўжо чацвёрты месяц днём і ноччу дастаўляюць ахвярам гуманітарную і юрыдычную дапамогу. У асноўным гэта людзі з арганізацый, якія гадамі дапамагаюць бежанцам... Ёсць таксама жыхары пагранічнай зоны, як жанчыны, так і мужчыны, якія далучаюцца на розных этапах, а таксама актывісты з усёй Польшчы», — распавяла Данута Куронь.

Аднак на працягу апошніх дзён, па меры ўзмацнення мілітарызацыі ў рэгіёне, актывісты і валанцёры перадаюць усё менш інфармацыі, і гэта маўчанне ўсё больш палохае. Данута Куронь звярнула ўвагу на «сістэматычна ўзрастаючую мілітарызацыю грамадскага жыцця» ў Польшчы, што прыводзіць да «зацягвання петляў» вакол людзей. «Сказаць, што прысутнасць сілавых структур разбурае штодзённае жыццё, — нічога не сказаць... Іх прысутнасць стварае ўмовы, якія пагражаюць жыццю», — заявіла Данута Куронь. У якасці прыкладу яна прывяла сітуацыю з грамадскай арганізацыяй «Урачы на граніцы», якая аказвала ў Польшчы бясплатную меддапамогу бежанцам. Валанцёры арганізацыі падвергнуліся нападу, іх аўтамабілі былі разбіты.

Але яшчэ больш шакуе інфармацыя аб мабілізацыі польскай лясной варты для дапамогі сілавым структурам на граніцы. У сувязі з гэтым Данута Куронь адзначае, што многія бежанцы, якія ў апошнія месяцы спрабавалі прабрацца праз польскія лясы і балоты, або былі злоўлены, або загінулі. «Гэта і магло быць сапраўднай прычынай мабілізацыі лясной аховы. Целы жанчын, мужчын і дзяцей, якія загінулі ад знясілення і холаду, хтосьці з набліжаных да ўлад павінен знайсці ў зоне і ціха, без сведак, прыхаваць», — заўважыла актывістка.

**Пётр ДУНЬКО.**

## У тэму

### НІВОДНАГА ПЛАЦЯЖУ ДЛЯ ДАПАМОГІ БЕЖАНЦАМ АД ЕС НЕ ПАСТУПІЛА

Аб гэтым заявіў журналістам прэс-сакратар МЗС Анатоль Глаз. «У сухім астатку ад Еўракамісіі, акрамя заяў аб намерах, нічога няма. Тэхнічныя эксперты падчас наведвання ТЛЦ з бежанцамі так і не паразмаўлялі», — адзначыў ён. Таксама паводле слоў Анатоля Глаза, бежанцам, якія жадаюць вярнуцца дадому, перашкод няма. Наадварот, аказваецца садзейнічанне, у тым ліку і ў афармленні дакументаў. Аднак іх пазіцыя застаецца нязменная, зазначыў прэс-сакратар МЗС. Бежанцы не жадаюць вяртацца дадому, яны ўсе маюць намер ісці на Захад.

«У свеце назіраецца глабальны міграцыйны крызіс. Бежанцы, якія тут знаходзяцца, уцякаюць не ад добрага жыцця. Уцякаюць яны з краін, дзе ў свой час добра павесяліўся Захад, са сваімі эксперыментамі, у тым ліку і «каляровымі рэвалюцыямі», пакінуўшы ў шэрагу краін хаос, — адзначыў Анатоль Глаз. — І Беларусь у гэтых авантурах ніякага ўдзелу не прымала. Мы — краіна транзіту, краіна, якая нясе з-за гэтага выдаткі», — звярнуў увагу прэс-сакратар МЗС.

«З красавіка мы неаднаразова прапаноўвалі Еўракамісіі абмеркаваць сітуацыю на граніцы, але атрымалі адмову», —- сказаў ён. Тады ж ЕС ініцыятыўна прыпыніў усе праграмы тэхнічнай дапамогі памежнага супрацоўніцтва. Сярод іх была, у прыватнасці, праграма будаўніцтва цэнтра для размяшчэння бежанцаў.

## Тым часам

Следчы камітэт праводзіць праверку па факце выяўлення бежанцаў з цялеснымі пашкоджаннямі на граніцы з Польшчай, паведамілі ў СК. Следствам устаноўлена, што ўвечары 21 лістапада на адным з участкаў пагранічнай заставы «Пясчатка» Камянецкага раёна была знойдзена група абяссіленых і змучаных бежанцаў. Пры першапачатковым медыцынскім аглядзе медыкамі ў 33-гадовага і 51-гадовага грамадзян Ірака выяўлены пераломы касцей ног.

«Са слоў пацярпелых стала вядома, што яны знаходзіліся ў складзе групы на тэрыторыі Польшчы. Там яны былі затрыманы мясцовымі пагранічнікамі, якія збілі іх і выдварылі ў Беларусь. На тэрыторыі нашай краіны пацярпелыя былі знойдзены супрацоўнікамі Дзяржпагранкамітэта», — расказалі ў ведамстве. Камянецкі РАСК па гэтым факце праводзіць праверку, назначаны судова-медыцынскія экспертызы для ўстанаўлення цяжкасці цялесных пашкоджанняў. Пацярпелым аказана медыцынская дапамога, двое з іх шпіталізаваны з цяжкімі траўмамі.

# Любоў да Радзімы пачынаецца з ведаў

## На чым грунтуецца работа па выхаванні патрыятызму ў Бярозаўскім раёне

**Са старшынёй Бярозаўскага райвыканкама Сяргеем БАРТАШАМ мы размаўляем пра асаблівасці работы па патрыятычным выхаванні моладзі, а таксама пра помнікі, музеі, святы вёсак, сустрэчы ў працоўных калектывах — словам, пра той падмурак, на якім будуецца ідэалагічная і выхаваўчая работа.**



***— Сёння ў Здзітаўскай школе мне расказвалі, як беражліва там захоўваецца памяць пра воінаў-вызваліцеляў, ветэранаў вайны, землякоў — воінаў-інтэрнацыяналістаў. Тое, што зрабілі мясцовыя краязнаўцы, уражвае. На Бярозаўшчыне таксама ёсць нямала памятных месцаў, якія ўвасабляюць гісторыю нашага краю і служаць напамінам, перасцярогай цяперашнім пакаленням...***

— Сапраўды так, — гаворыць Сяргей Іванавіч. — Крыху больш за два месяцы таму мы адкрылі мемарыял на месцы канцлагера «Бяроза-Картузская», праз які з 1934 да 1939 года прайшло каля 10 тысяч зняволеных. На гэтым месцы быў абеліск, пастаўлены яшчэ ў 1962 годзе. І вось на пасяджэнні круглага стала па пытаннях увекавечання памяці маладзёжны парламент прапанаваў стварыць мемарыял, які б нагадваў пра адзін з самых жорсткіх лагераў для палітзняволеных XX стагоддзя. Як вядома, пазней фашысты пры ўзвядзенні сваіх канцлагераў скарыстоўвалі вопыт Бярозы-Картузскай.

Мы знайшлі падтрымку ў Міністэрстве культуры, іншых ведамствах, і 17 верасня мемарыял быў урачыста адкрыты. У Чырвоных казармах цяпер з'явілася музейная экспазіцыя па гэтую тэму. Праходжу міма і заўважаю, што каля падножжа помніка ляжаць жывыя кветкі. Значыць, людзі прыходзяць сюды, ушаноўваюць памяць. Лічу, што мы неапраўдана забыліся пра гэтую старонку гісторыі, а цяпер выпраўляем памылку. У нас ёсць дастаткова матэрыялаў на гэтую тэму, дакументальных сведчанняў. Ды што там дакументы! Людзі, сведкі жывыя ёсць. Напрыклад, на мітынгу падчас адкрыцця мемарыяла выступаў сын вязня лагера, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Фёдар Сцяпанавіч Труцько. Калі дазваляе здароўе, ён сустракаецца з моладдзю, выступае ў школьных калектывах. Былы рэдактар раённай газеты Яўген Сяленя мае багаты матэрыял пра лагер у Бярозе. Ёсць і другія краязнаўцы, што займаліся гэтай тэмай. Нездарма ж кажуць, што трэба памятаць, каб не паўтарылася. Памятаць — значыць напамінаць, чаму і служыць мемарыял. Днямі назіраў, як падышла група падлеткаў, спыніліся каля помніка, прачыталі надпіс і ўзяліся за тэлефоны. Значыць, гугляць, шукаюць інфармацыю ў інтэрнэце, каб больш даведацца пра падзеі таго часу, калі людзі з Заходняй Беларусі пакутавалі пад польскай акупацыяй.

Ну а самая трагічная і страшная старонка гісторыі раёна ваеннага часу — гэта Бронная Гара. Больш за 50 тысяч чалавек было знішчана на гэтым месцы. Цяпер вось, калі ў Стасіне Столінскага раёна адкрывалі мемарыял, мы вырашылі, што ў нас ён павінен быць абавязкова. Тут адных толькі дзяцей забіта па розных звестках ад 12 да 17 тысяч. Вязняў з Брэста, Пінска, Кобрына падвозілі эшалонамі, людзей падводзілі да траншэй, укладвалі тварам уніз і расстрэльвалі. Пры гэтым хто паміраў адразу, а хто, паранены, доўга канаў пад цяжарам цел і пяску, прысыпанага зверху. Больш зверскага спосабу расправы над мірнымі, ні ў чым не вінаватымі людзьмі цяжка і прыдумаць. Акрамя таго, пры адступленні гітлераўцы паспрабавалі замесці сляды злачынстваў, прыводзілі сюды ваеннапалонных, людзей з найбліжэйшых вёсак, загадвалі адкопваць і спальваць астанкі. А тых, хто рабіў гэта, пазней расстрэльвалі, каб не пакідаць сведак... Адным словам, гэта месца павінна быць дастойна ўвекавечана. І райвыканкам хутка зоймецца ўзгадненнем пытанняў з чыгункай, энергетыкамі, лясной гаспадаркай. У першую чаргу звернемся па падтрымку да Міністэрства культуры. Тут патрэбны маштабныя работы па добраўпарадкаванні, пракладцы дарог і вырабе мемарыяла. Сюды павінны ездзіць экскурсіі, бываць школьнікі, моладзь. Такія трагедыі не могуць адыходзіць на другі план з гадамі, нават са стагоддзямі.

Трэба помніць пра ўсе ахвяры, якімі здабыты Перамога і мір на нашай зямлі. Так, напрыклад, як помняць у Здзітаве. Там працуюць людзі, якія любяць сваю школу, сваю краіну, сваю работу. Школьным музеем можа ганарыцца ўся вёска, нават раён. Музей падтрымлівае перапіску са сваякамі герояў-вызваліцеляў. Школа не губляе сувязяў з выпускнікамі, ладзяцца цікавыя мерапрыемствы, дзеці прыцягваюцца да краязнаўчай, работы, так па крупінках і выхоўваецца патрыятызм, любоў да малой радзімы.

***— Наколькі я ведаю, у сваёй рабоце вы вялікую ўвагу ўдзяляеце сустрэчам у працоўных калектывах, па месцы жыхарства. Якія праблемы хвалююць людзей, якія падказкі для іх вырашэння знаходзіце на такіх сустрэчах?***

— Здавалася б, такіх сустрэч у нас дастаткова ў працоўных калектывах, на днях вёсак, на сельскіх сходах. Але нядаўна, падчас гутаркі ў новым мікрараёне, я прыйшоў да высновы, што мы недаацэньвалі гэтую форму стасункаў з насельніцтвам. Дык вось, на сустрэчу ў раёне новай забудовы прыйшла пераважна моладзь. Іх хвалявалі пытанні добраўпарадкавання, камфортнага пражывання. Ніякіх завоблачных праблем яны не ўздымалі, не патрабавалі імгненнага вырашэння пытанняў. Людзі выказвалі разуменне, пагаджаліся з тым, што асобныя пытанні могуць быць вырашаны ў перспектыве. Многія былі рады таму, што іх паслухалі, пра іх патрэбы ведае мясцовая ўлада. Навасёлы пазнаёміліся адно з адным. Падумалася тады, што праз адну-дзве падобныя сустрэчы яны арганізуюцца і самі засыплюць тую яму альбо прыбяруць камень, які перашкаджае. Важна бывае не толькі дапамагчы, але і даць кірунак, падштурхнуць на добрую справу.

Яшчэ выкарыстоўваем такую форму работы, як месячнік сельскіх Саветаў. Гэта цэлы комплекс мерапрыемстваў, у які ўваходзяць прыёмы грамадзян, сустрэчы з людзьмі на сельскім сходзе. Уздымаюцца праблемы, вызначаюцца шляхі іх вырашэння. Ідзе дыялог з сельскімі жыхарамі на карысць тэрыторыі.

***— Ведаю, што ў арсенале ідэалагічнай работы шырока выкарыстоўваецца сацсеткі, тэлеграм-канал. Ці эфектыўныя такія спосабы?***

— Надзвычай эфектыўныя. Працуем разам з рэдакцыяй раённай газеты, якая і вядзе тэлеграм-канал. Скажам, запусцілі апытанне, як лепш выкарыстаць сродкі, заробленыя на суботніку. І большасць апытаных выказалася за ўпрыгажэнне горада, фарбоўку фасадаў будынкаў па цэнтральных вуліцах райцэнтра. Былі прапановы, напрыклад, набыць дзіцячую пляцоўку, паставіць у адным з жылых мікрараёнаў. Але ж апошняе выклікала б нараканні жыхароў іншых раёнаў, дзе такая пляцоўка не з'явілася б. Таму найлепшым выглядала калектыўнае рашэнне ўпрыгожыць горад, абнавіць яго. Налета пасля суботніка зноў параімся з гараджанамі, як лепш выкарыстаць сродкі.

***— У аддзеле ідэалагічнай работы і па справах моладзі мне расказалі, што нядаўна была вялікая нарада па пытаннях ваенна-патрыятычнага выхавання школьнікаў. Якія кірункі ў гэтай рабоце вызначаны?***

— Адзін з іх прадугледжвае вызначэнне памятных месцаў, славутасцяў, гістарычных асоб — выхадцаў з Бярозаўшчыны, пра якія выпускнік любой школы мог бы з гонарам расказаць, куды б ні закінула яго ў далейшым жыццё. Для гэтага кожны школьнік павінен наведаць славутыя мясціны, паслухаць кваліфікаванага экскурсавода, замацаваць атрыманыя веды на ўроку. З моладдзю трэба гаварыць таксама пра перавагі і дасягненні нашай краіны, раскладваць усё па паліцах: на прыкладах паказваць роўныя магчымасці для ўсіх, сацыяльную справядлівасць, даступнасць медыцыны і адукацыі, гарантыі якасці жыцця. Любоў да сваёй малой радзімы, да краіны ў цэлым пачынаецца з ведаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «ПЕРШЫ БЛІН» НЕ КОМАМ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Ідэі ў іх унікальныя, таму мы заўсёды стараемся ўвасабляць іх у жыццё. Мазыршчына — месца, дзе створаны добрыя ўмовы для моладзі: у кожнага ёсць магчымасць рэалізаваць сябе, — адзначыла **старшыня Мазырскага райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА.**

Кіраўнік раёна падкрэсліла: прадпрыемствы і арганізацыі робяць асаблівую стаўку на свежыя сілы.



Малады спецыяліст СШ № 11 г. Мазыра настаўніца матэматыкі Таццяна ДЗЯДЗЮЛЯ.

## СІСТЭМА НАСТАЎНІЦТВА

Штогод прымае на работу маладых спецыялістаў мазырскае прадпрыемства «Беларускабель». Яго калектыў захоўвае і развівае сістэму настаўніцтва: навічкоў замацоўваюць за прафесіяналамі, якія гатовы дзяліцца вопытам, уводзіць у курс спраў.

— Ад моладзі чакаем добрай тэарэтычнай падрыхтоўкі, імкнення рэалізаваць у жыццё тое, чаму навучыліся. Гатовы садзейнічаць іх станаўленню і прафесійнаму росту — гэта ў інтарэсах прадпрыемства, — зазначыла **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце, кадрах і сацыяльных пытаннях ААТ «Беларускабель» Святлана ФЕШЧАНКА.**

Сёлета прадпрыемства прыняла на работу чатырох маладых спецыялістаў. Усіх характарызуюць станоўча: працы не баяцца, а гэта, кажуць вопытныя працаўнікі, галоўнае.

Свае першыя крокі ў працягу працоўнай дынастыі на прадпрыемстве робіць дыпламаваны інжынер-электронік выпускнік Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. А. Сухога Яўген Кашкараў.

— Вельмі задаволены сваім размеркаваннем, — прызнаўся ён. — Я мазыранін, вучыўся ў сярэдняй школе № 5. Пасля паступіў ва ўніверсітэт на прамысловую электроніку. На гэтую спецыяльнасць параіў звярнуць увагу бацька. Ён, дарэчы, працаваў на прадпрыемстве ў якасці электрамеханіка. Працавала тут, у валачыльным цэху, і бабуля.

## ШТО БУДУЮЦЬ МАЛАДЫЯ

У перспектыўных кадрах і маладых працоўных руках зацікаўлены і прадпрыемствы будаўнічай сферы раёна. Такім рады на ААТ «Мазырпрамбуд». Прадпрыемства па выніках мінулага года — пераможца спаборніцтва па сацыяльна-эканамічным развіцці Мазырскага раёна сярод будаўнічых арганізацый. Першае працоўнае месца тут — не толькі каштоўны вопыт, але і магчымасць папрацаваць на знакавых для палескага рэгіёна будаб'ектах. У мінулым годзе, напрыклад, калектыў «Мазырпрамбуда» вызначыўся на будаўніцтве жылых дамоў у Ельску, Мазыры, Нароўлі, узвядзенні інжынернай інфраструктуры, аб'ектаў Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, браў удзел у добраўпарадкаванні Мазыра.

— Баялася, што не здужаю з працай, але тут дапамагаюць і вучаць, — дзеліцца 18-гадовая маляр-тынкоўшчыца Марыя Віткоўская, якая ўладкавалася сюды сёлета.

## ПРАВА ЗАЯВІЦЬ АБ САБЕ

У сярэдняй школе № 11 Мазыра сёлета на першае працоўнае месца ўладкаваліся два маладыя спецыялісты — настаўнікі гісторыі і грамадазнаўства Юлія Каваленка і фізічнай культуры Антон Новак.

— У мяне з вучнямі ёсць і агульныя інтарэсы, бо розніца ва ўзросце невялікая, але ў той жа час патрабую абавязковага захоўвання субардынацыі. Бо я настаўнік, а яны дзеці, — расказвае аб сваёй рабоце Юлія Васільеўна. — Для мяне педагогіка — маё жыццё. Мне вельмі падабаецца вучыць дзяцей новаму.

Малады педагог узяла на сябе класнае кіраўніцтва ў пятым класе. Адгукнулася і на прапанову весці музейную справу ў школе: рыхтуе новыя экспазіцыі для Музея жанчын.

Выпускніца Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна Хрысціна Вараненка сумяшчае навучанне ў магістратуры мазырскага ВНУ з выкладаннем матэматыкі. Пасля заканчэння магістратуры яна застанецца ў школе ўжо ў статусе маладога спецыяліста. Другі год працягваюць работу ў такім статусе настаўніца матэматыкі Таццяна Дзядзюля і настаўнік фізічнай культуры Ігар Лакіза. Дарэчы, малады чалавек пачаў працаваць у школе яшчэ на чацвёртым курсе ўніверсітэта.

— Штогод мы прымаем на працу маладых спецыялістаў. Па выніках апытання відаць, наколькі яны задаволены размеркаваннем у нашу школу. Усе гэтыя маладыя людзі вельмі амбіцыйныя, творчыя, маюць актыўную грамадзянскую пазіцыю, могуць тут рэалізаваць свае ідэі і задумкі, — лічыць **дырэктар сярэдняй школы № 11 Мазыра Яўгенія ВАРАНОВІЧ.** — У настаўнікаў нашай школы вельмі высокі педагагічны ўзровень, імёны некаторых ведаюць у горадзе, рэгіёне і краіне. Прафесіяналы, у якіх за плячыма значны працоўны досвед, гартуюць годную змену. Маладых спецыялістаў імкнёмся падтрымаць і ў матэрыяльным плане: забяспечыць добрую працоўную нагрузку, каб быў належны заробак.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ПРЫРОДНЫЯ АНТЫБІЁТЫКІ

## Дзе іх шукаць і як ужываць, каб падтрымаць імунітэт

**У постковідную эпоху неабходнасць захаваць здароўе з глабальнай мэты ператварылася ў задачу надзённую, што настойліва патрабуе вырашэння. Хтосьці скупляе вітамінныя комплексы і імунамадулятары ў аптэках, а хтосьці перакручвае на мясарубцы каліну з мёдам і ў любую страву дадае часнок і імбір. Прыродныя антыбіётыкі: ці сапраўды яны валодаюць унікальнымі ўласцівасцямі? Пра гэта мы спыталі ў навуковага супрацоўніка аддзела харчавання РНПЦ НАН Беларусі па харчаванні Ганны ЖУРНІ.**

### ЗДАРОЎЕ ПАДОРЫЦЬ ПРЫРОДА?

***— Што такое наогул натуральныя, або прыродныя антыбіётыкі? Яны сапраўды лечаць?***

— Многія сучасныя антыбіётыкі атрымліваюць на аснове прыродных крыніц. Некаторыя экстракты раслін, эфірныя алеі і нават харчовыя прадукты валодаюць антыбіятычнымі ўласцівасцямі. Праведзены шэраг даследаванняў, якія паказваюць, што некаторыя прыродныя антыбіётыкі могуць быць настолькі ж эфектыўныя пры знішчэнні патагенных бактэрый, як і сінтэтычныя прэпараты. Прыродныя, ці натуральныя антыбіётыкі — гэта натуральныя лекі, якія вызначаюцца шырокім спектрам супрацьмікробнай актыўнасці і выкарыстоўваюцца пры лячэнні пачатковых стадый многіх запаленчых захворванняў інфекцыйнай прыроды, не аказваючы шкоднага ўздзеяння на арганізм чалавека.

***— Наяўнасць якіх рэчываў абумоўлівае лячэбны эфект?***

— Усе яны ўтрымліваюць розныя рэчывы, што абумоўліваюць іх антыбактэрыяльныя, супрацьвірусныя і супрацьзапаленчыя ўласцівасці. Напрыклад, антыбактэрыяльны эфект **мёду** абумоўлены ўтрыманнем у ім пераксіду вадароду. Мёд выкарыстоўваецца ў традыцыйнай медыцыне пры лячэнні туберкулёзу, вочных хвароб, інфекцый горла, бранхіяльнай астмы, заражэння гельмінтамі, экзэмы, запораў, для гаення язваў і г. д. Са старажытных часоў мёд наносілі на раны для гаення і прадухілення развіцця інфекцыі. Сучасная медыцына даказала эфектыўнасць выкарыстання мёду супраць залацістага стафілакока, а таксама супраць многіх бактэрыяльных патагенаў і грыбкоў.

Адзін з самых вядомых прыродных антыбіётыкаў — **імбір**. У яго складзе галоўныя кампаненты — эфірны алей і фенольныя злучэнні (у прыватнасці, гангліролы і шагаолы), таксама прысутнічаюць арганічныя кіслоты (шчаўевая, бурштынавая, яблычная), вугляводы (кіслоза, глюкоза, лактоза, мальтоза), поліцукрыды і дубільныя рэчывы.

Вядома, што супраць розных відаў бактэрый, уключаючы кішачную палачку, залацісты стафілакок, Pseudomonas aeruginosa эфектыўны водны экстракт **гваздзікі**. Актыўны кампанент гваздзікі — эўгенол, вызначаецца выдатнымі антыбактэрыяльнымі ўласцівасцямі.

Самая вядомая спецыя, якая валодае супрацьмікробнымі ўласцівасцямі, — **куркума**. Карэнішчы куркумы ўтрымліваюць складаны комплекс біялагічна актыўных злучэнняў, сярод якіх асноўныя — куркуміноіды, тумероны і куркумены. Бактэрыцыдная актыўнасць гэтых рэчываў была ўстаноўленая яшчэ ў 1949 г., а ў наступныя 30–40 гадоў даказана супрацьзапаленчае, гіпаглікемічнае, антыаксідантнае, ранazагойваючае, жаўцягоннае, супрацьбрыклівае, антымутагеннае, проціпухліннае і дэтаксікацыйнае дзеянне.



Бактэрыцыдныя ўласцівасці **брусніц** абумоўлены наяўнасцю ў іх бензойнай кіслаты. Гэта натуральны кансервант, які спыняе развіццё хваробатворных бактэрый. **Журавіны** змяшчаюць кіслоты, дзеянне якіх ідэнтычнае дзеянню антыбіётыкаў супраць мікробаў класа E. Coli (вялікая група бактэрый, што выклікаюць запаленні нырак, мачавога пузыра, інфекцыйны гастраэнтэрыт). Устаноўлена, што экстракт журавін эфектыўна дзейнічае нават супраць штамаў бактэрый, устойлівых да традыцыйных антыбіётыкаў. Гаючыя ўласцівасці дадзеных ягад перашкаджаюць распаўсюджванню бактэрый Helicobacter Pilori, якія выклікаюць язву страўніка.

**Абляпіха**, асабліва абляпіхавы алей, утрымліваюць вітаміны, дубільныя рэчывы, а таксама алеінавую, стэарынавую, ліналевую і пальмецінавую тлустыя кіслоты, дзякуючы якім гэта выдатны бактэрыцыдны, ранагазойваючы, супрацьзапаленчы сродак.

### АД СЯМІ ХВАРОБ

***— Самыя папулярныя ў нашых шыротах сродкі «ад усіх хвароб» — часнок і цыбуля. Пачнём з часнаку: у яго сапраўды настолькі магутнае супрацьвіруснае ўздзеянне?***

— У розных культурах ва ўсім свеце **часнок** прызнаны лячэбным і прафілактычным сродкам з-за яго антыбактэрыцыдных, супрацьгрыбковых і супрацьвірусных уласцівасцяў. У яго склад уваходзіць больш за 400 актыўных рэчываў. Малады часнок змяшчае важную незаменную амінакіслату — тыямін. Часнок багаты на ёд, жалеза, натрый, марганец, калій і магній. Сульфіды ў яго складзе эфектыўна супрацьстаяць бактэрыям, вірусам і развіццю небяспечных інфекцыйных захворванняў. Самы важны актыўны кампанент часнаку — аліцін, які, акрамя барацьбы з бактэрыямі і вірусамі, здольны прыводзіць у норму ўтрыманне «дрэннага халестэрыну» ў крыві. Рэгулярны прыём часнаку зніжае рызыку з'яўлення атэрасклератычных бляшак, развіцця гіпертаніі і захворванняў сэрца. Біялагічна актыўнае рэчыва аджаен, якое змяшчаецца ў часнаку, разрэджвае кроў, перашкаджаючы з'яўленню тромбаў.

***— Ці ёсць па часнаку супрацьпаказанні?***

— Яго не рэкамендуецца ўжываць пры наступных паталогіях: гастрыт, панкрэатыт, вострыя захворванні СКТ, анемія, гемарой, індывідуальная непераноснасць, праблемы з мочаспусканнем. Празмернае ўжыванне гэтага прадукту можа прывесці да галаўных боляў, запаволенай рэакцыі. Часнок раздражняе нервовую сістэму, таму не рэкамендуецца ўжываць яго на ноч. Каб атрымаць максімальную карысць і мінімум пабочных эфектаў, на дзень лепш абмежавацца 3-4 зубчыкамі.

***— Ну, а цыбуля — чым абумоўлена яе супрацьмікробнае ўздзеянне?***

— **Цыбуля** змяшчае велізарную канцэнтрацыю флаваноідных поліфенолаў. Чырвоная рэпчатая цыбуля асабліва багатая на супрацьзапаленчы фітанутрыент — кверцацін. Аднак гэтага рэчыва досыць шмат і ў белай, і ў жоўтай цыбулі. Таксама яна багатая на клятчатку: ўжыванне цыбулі паскарае страваванне і спрыяе фарміраванню здаровага мікрабіёму кішэчніка. Свежая цыбуля, як і часнок, валодае супрацьтрамбозным эфектам, аднак тэрмічная апрацоўка пазбаўляе яе гэтай уласцівасці. А тое, што фітанцыды цыбулі пагібельна ўплываюць на патагенныя бактэрыі, было ўстаноўлена яшчэ ў першай палове мінулага стагоддзя. Сучасныя даследаванні адкрываюць новыя перспектывы выкарыстання лячэбных уласцівасцяў рэпчатай цыбулі. Перспектыўнай лічыцца распрацоўка і прымяненне прэпаратаў цыбулі для паляпшэння функцыянавання сардэчнай мышцы, гладкай мускулатуры, сакраторных залоз сістэмы стрававання. Цыбулю з яе сок ужываюць пры функцыянальным зніжэнні тонусу сценак кішэчніка, хранічных запорах, ныручнакаменнай хваробе, ацёках. Прычым пры хранічных захворваннях часта раяць проста ўводзіць цыбулю ў рацыён на пастаяннай аснове або штодня дадаваць у ежу невялікую колькасць цыбульнага соку (ад 1 ч. л. да 1-2 ст. л.).

***— У цыбулі таксама ёсць супрацьпаказанні?***

— Так, празмернае ўжыванне проціпаказанае людзям з язвай страўніка і дванаццаціперснай кішкі, пацыентам, што маюць гастрыт (такая агародніна павышае кіслотнасць страўнікавага соку) і панкрэатыт. Цыбуля проціпаказаная пры захворваннях выдзяляльнай сістэмы, печані, нырак.

***— Як правільна ўжываць цыбулю і часнок не з мэтай зрабіць ежу смачнейшай, а дзеля прафілактыкі і лячэння?***

— З лячэбнай мэтай цыбулю і часнок пажадана выкарыстоўваць у свежым выглядзе. Тэрмічная апрацоўка можа знішчыць усе карысныя рэчывы. Антыбактэрыяльнае ўздзеянне часнаку і цыбулі, якія захоўваліся ў халадзільніку чатыры месяцы, зніжаецца прыкладна ўдвая. А падчас захоўвання пры пакаёвай тэмпературы гэтыя віды агародніны цалкам страчваюць сваё фітанцыдныя ўласцівасці праз восем месяцаў.

### ХРЭН ЗА РЭДЗЬКУ НЕ САЛАДЗЕЙШЫ

***— Хрэн, рэдзька і кіслая капуста — таксама прыродныя антыбіётыкі?***

— У народнай медыцыне **хрэн** рэкамендуюць пры захворваннях, якія суправаджаюцца моцным кашлем, — галоўным чынам, пры бранхітах. У хрэне ўтрымліваюцца фітанцыды, што дапамагаюць арганізму справіцца з інфекцыяй. Хрэн знішчае інфекцыю ў поласці рота і перашкаджае развіццю зубнога карыесу (яго выкарыстоўваюць у вытворчасці некаторых зубных паст). Эфірныя алеі **рэдзькі** валодаюць выразнымі антысептычнымі ўласцівасцямі. Фітанцыды рэдзькі здольныя падаўляць розныя бактэрыі, у тым ліку і бактэрыі, што насяляюць тоўсты кішэчнік. Рэдзька валодае многімі гаючымі ўласцівасцямі. Ужыванне яе ў ежу паказана пры прастудных захворваннях, а таксама хваробах, якія суправаджаюцца кашлем (сок рэдзькі — выдатны адхарквальны сродак), у тым ліку пры коклюшы. Рэдзька можа палегчыць стан хворага пры падагры, радыкуліце. Мінеральныя рэчывы, крыніцай якіх з'яўляецца рэдзька, трапіўшы ў арганізм, спрыяюць нармалізацыі салявога абмену. Здаўна ў медыцыне выкарыстоўваецца мачагоннае і жоўцегоннае ўздзеянне рэдзькі.

> **«Праведзены шэраг даследаванняў, якія паказваюць, што некаторыя прыродныя антыбіётыкі могуць быць настолькі ж эфектыўныя пры знішчэнні патагенных бактэрый, як і сінтэтычныя прэпараты».**

**Квашаная капуста** — прадукт, які быў пад уздзеяннем ферментацыі (узбагачаны жывымі прабіятычнымі бактэрыямі). Пры яе ўжыванні паляпшаецца страваванне, умацоўваюцца ахоўныя сілы арганізма, ўзмацняецца імунная сістэма і падаўляецца патагенная мікрафлора.

***— Імбір — як яго правільна ўжываць?***

— Імбір варта з асцярожнасцю ўжываць людзям з хваробамі страўніка, кішэчніка, печані і жоўцевага пузыра. Таксама варта адмовіцца ад яго тым, хто мае сардэчна-сасудзістыя захворванні: ён узмацняе крывацёк, памяншае вязкасць крыві, што можа прывесці да пагаршэння стану здароўя. Корань імбіра карыснейшы за парашок. Яго можна жаваць сырым, дадаваць у напоі, у якасці спецыі класці ў стравы. Здаровым дарослым людзям можна ўжываць да 3-4 грамаў свежага імбіру ў дзень, але не нашча. А калі імбір у парашку, лепш абмежавацца паловай чайнай лыжкі: у сухім стане ён больш канцэнтраваны. Калі купляеце імбір, правярайце, каб корань быў шчыльны, цвёрды, сухі. Ён аддасць максімум карысных рэчываў, калі надзерці яго на дробнай тарцы або нарэзаць тонкімі слайсамі, а ў страву або напой дадаваць адразу перад ужываннем.

**Размаўляла Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Надвор'е

## У выхадныя — мокры снег і дождж

**Сёння тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца пад уплывам цёплай і вільготнай паветранай масы, днём на паўднёва-заходнія раёны краіны перамесціцца атмасферны фронт, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Па паўднёвым захадзе краіны пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Вецер будзе паўднёва-заходні, паўднёвы парывісты. Тэмпература паветра днём — ад нуля да 6 градусаў цяпла.

У суботу пад уплывам цыклону найбольш складаныя ўмовы надвор'я чакаюцца па паўночным захадзе краіны, дзе пройдуць ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу, месцамі моцныя. У асобных раёнах чакаюцца наліпанне мокрага снегу і галалёдныя з'явы, у той час як па паўднёвым усходзе краіны пройдуць дажджы. Тэмпература паветра ноччу — ад мінус 2 да плюс 5 градусаў. Днём будзе вагацца ад мінус 1 градуса па паўночным захадзе да плюс 7 па паўднёвым усходзе краіны.

У нядзелю ноччу на большай частцы тэрыторыі, а днём пераважна па заходняй палове краіны пройдуць мокры снег і дождж. Уначы і раніцай па паўночным усходзе месцамі будзе наліпанне мокрага снегу, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер пераменных напрамкаў, умераны. Тэмпература паветра ноччу складзе мінус 2 плюс 3 градусы, днём — ад нуля да +7. У панядзелак на большай частцы тэрыторыі краіны будуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман, слабы галалёд. Тэмпература паветра ў начны час складзе мінус 2 плюс 4 градусы, днём — ад нуля да плюс 6, па паўднёвым усходзе — да 8 цяпла. У аўторак у Беларусь пачне паступаць халаднаватая паветраная маса са Скандынавіі. У многіх раёнах краіны пройдуць ападкі, у асноўным снег, мокры снег, па паўднёвым усходзе з дажджом. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 4 да плюс 2 градусаў.

Далікатная тэма

# АПОШНІ ПРЫСТАНАК У СПІСАХ НЕ ЗНАЧЫЦЦА...

**Аляксандра Матошку з Расоншчыны многія ведаюць як аўтара звяздоўскай рубрыкі «Алё, народ на провадзе! Або вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў». Але гэтым разам ён даслаў у рэдакцыю іншую гісторыю. Праўдзівую. Але зусім НЕ вясёлую...**



На фотаздымку відаць, што месца ўсюды хапае...

## «Людзі, што вы робіце? Так жа нельга!»

«Нават у самым страшным сне не мог убачыць тое, пра што прыйдзецца напісаць у газету, — дзеліцца сваімі перажываннямі Аляксандр Іванавіч, які жыве ў вёсцы Янкавічы. — 29 кастрычніка я страціў права быць пахаваным побач са сваёй жонкай, якая памерла 13 гадоў таму. З якой мы нарадзілі чацвёра дзяцей».

Справа ў тым, што 27 кастрычніка ў Янкавічах раптоўна памерлі дзве жанчыны. Родзічы ж узялі і пахавалі маці з дачкой у 30 сантыметрах ад магілы жонкі Аляксандра Матошкі.

«Няўжо нельга было зрабіць усё па-людску, адступіўшы нейкія два метры?» — абураецца Аляксандр Іванавіч.

Не разумее наш чытач і таго, чаму работнікі сельсавета дапусцілі такую прыкрую сітуацыю. Бо згодна з рашэннем Расонскага райвыканкама № 146 ад 18.03.2020 года менавіта яны павінны выдзяляць зямельныя ўчасткі для пахавання ў сельскай мясцовасці. Але ж ніхто з работнікаў сельсавета не прыходзіў на могілкі, канкрэтнае месца не паказваў.

«Калі гаротных хавалі, адна неабыякавая жанчына пазваніла старшыні Янкавіцкага сельскага Савета (Таццяне Кальнінай, аднакласніцы маёй памерлай жонкі), маўляў, людзі, што вы робіце? Гэтак жа нельга!.. Але было ўжо позна нешта мяняць...»

Наша чытач не рэзерваваў сабе месца для пахавання побач з магілай жонкі. Спадзяваўся, што гэта само сабой для ўсіх зразумела. «Гэта ж не Полацкія могілкі, дзе шмат чаго абязлічана. А маленькая вёска, дзе ўсе пра ўсіх усё ведаюць. Зразумела, што павінен я там легчы. Аказваецца — далёка не для ўсіх...»

Калі Аляксандр Матошка паспрабаваў нешта высветліць па тэлефоне з братам і сынам памерлых, які арганізоўваў пахаванне, то сутыкнуўся з грубасцю і хамствам. «Ніхто нават не падумаў папрасіць прабачэння за гэткую бяздушнасць», — кажа Аляксандр Іванавіч.

Калі наш чытач даведаўся, што чужых жанчын пахавалі пад бокам у яго жонкі, — быў, мякка кажучы, у шоку. «У мяне падняўся ціск, я рэзка саскочыў з імунітэту... Цяпер ужо крыху супакоіўся... Махнеш рукой, ды ўсё... Хопіць на вялікім рахунку. Але ж... Нельга так адносіцца да гэтых глыбокіх этычных нормаў. Я ні з кім сварыцца не хачу. Як той казаў, цягнік сышоў, ужо нічога не зменіш. Няхай ляжаць тыя жанчыны спакойна. Адно прыкра, што ў будучым іх магілы будуць неахайныя, закінутыя...»

## «Сказалі, што будуць хаваць побач са сваячкай. А зрабілі па-іншаму...»

Пасля размовы з Аляксандрам Матошкам я патэлефанавала ў Янкавіцкі сельскі Савет. Пацікавілася, як атрымалася такая сітуацыя? Кіраўнік спраў Таццяна Кандрацьева растлумачыла, што на тэрыторыі сельсавета не адны могілкі, а цэлых 14. І ўсе яны на рознай адлегласці ад адміністрацыйнага будынка.

«У сельсавеце працуюць два чалавекі: я і старшыня. Ніхто з нас, вядома, не стаіць на кожным пахаванні», — заўважае жанчына. І яе можна зразумець.

Ужо потым, як правіла, на наступны дзень старшыня сельсавета едзе і фіксуе свежую магілу. Ужо па факце прысвойваюць ёй нумар і ўносяць у спецыяльную камп'ютарную праграму месца, дзе пахаваны чалавек. З 2014 года работнікі сельсавета наогул вялі толькі ўлік пахаванняў. Больш як год таму з'явілася новае рашэнне райвыканкама.

«Цяпер, калі да нас прыходзяць сваякі памерлага і пішуць заяву на атрыманне матэрыяльнай дапамогі, мы разам абмяркоўваем, дзе яны плануюць хаваць сваіх блізкіх, — кажа Таццяна Кандрацьева. — Я даю аловак і прашу намаляваць схемку, якія магілкі знаходзяцца побач. Як правіла, усе выбіраюць месца побач са сваякамі, што ў прынцыпе лагічна. Ніякага пісьмовага дазволу мы не выдаём, усё робіцца на словах».

Дагэтуль не ўзнікала ніякіх пытанняў: як дамовіліся, так і хаваюць. І родзічам памерлых маці і дачкі работнікі сельсавета раілі хаваць сваіх каля магілы роднай сястры мужа адной з жанчын. А яны зрабілі па-іншаму... Узялі і пахавалі побач з чужымі людзьмі.

«Вы ж уяўляеце, што такое вясковыя могілкі? — працягвае мая суразмоўніца. — Там жа і кусты недзе. Відаць, яны пахадзілі-пахадзілі... Убачылі добрае, прыбранае месца. У Матошак на могілках заўсёды чысценька. І пахавалі там. Не падумалі... Пахавалі, вядома, вельмі блізка. Так, як хаваюць на гарадскіх могілках, дзе дэфіцыт месцаў. Ямы ж капала рытуальная служба з Полацка».

У адпаведнасці з нашым заканадаўствам, чалавеку бясплатна выдзяляюцца два месцы на могілках (што гарантуе пахаванне на гэтым участку не толькі памерлага, але і ў будучым аднаго з яго блізкіх сваякоў). Пры жаданні можна зрабіць радавое пахаванне і зарэзерваваць звыш двух месцаў. Але гэта ўжо платная працэдура. Побач з жонкай Аляксандра Іванавіча Любоўю пахавана яе маці, якая памерла ў 2012 годзе. Такім чынам, двухмесны ўчастак, які выдзяляецца на бясплатнай аснове, сям'я выкарыстала.

«Заяву на пашырэнне ўчастка ніхто не пісаў, — кажа Таццяна Кандрацьева. — Калі Аляксандр Іванавіч хацеў там зрабіць радавое пахаванне, трэба было зарэзерваваць участак. Ну, ці хоць бы проста калкамі яго абазначыць, як робяць некаторыя. Тады б ніхто б там не пахаваўся».

...Вось і атрымліваецца, што па законе быццам бы нічога не парушана: жанчын пахавалі на свабодным участку, месца ж не было зарэзервавана. А па-чалавечы?..

«Па-чалавечы, зразумела, крыўдна, няправільна, — дадае Таццяна Фёдараўна. — Таму Аляксандр Іванавіч і абураўся. Тэлефанаваў і пытаўся, ці дазволім мы яму пахавацца ў галавах жонкі. Там ёсць месца і з іншага боку. Калі ён хоча зарэзерваваць яго, мы можам тое зрабіць у любы дзень. Але для вясковых людзей гэта пакуль нязвыкла... Калі ў Расонах ужо плацяць грошы і рэзервуюць месцы на могілках, то на тэрыторыі нашага сельскага Савета пакуль не было прэцэдэнту».

## «Можна спадзявацца на разуменне і спагаду. Але лепш падкласці саломкі...»

Так ужо склалася, што ў невялікіх вёсках многія рэчы дагэтуль пускаюць на вусную дамоўленасць. А потым, калі штосьці здараецца, кусаюць локці... Спасылаюцца на чалавечнасць ці на паперку...

Але, як паказвае жыццё, калі разлічваць толькі на вусную дамоўленасць, адпрацаваная схема рана ці позна дасць збой. Як гэта, прынамсі, і адбылося ў сітуацыі, у якую трапіў наш чытач.

Але ж, пагадзіцеся, усё магло б скласціся інакш, калі б Аляксандр Іванавіч афіцыйна зарэзерваваў тое месца на могілках побач з жонкай. Ну, ці хоць бы сімвалічна адгарадзіў кавалак зямлі... Ці калі б работнікі сельсавета прысутнічалі на ўсіх пахаваннях. Хоць уявіць гэта даволі складана.

Лепш, вядома, загадзя пранумараваць усе вольныя ўчасткі на могілках і даваць пісьмовы дазвол на пахаванне ў канкрэтным месцы. Праўда, тут ёсць свае цяжкасці. Вясковыя могілкі — не гарадскія, дзе ўся зямля падзеленая на сектары, рады, роўненька, пад лінеечку. Там людзі пахаваныя часта вельмі хаатычна, магілкі размешчаныя і ўздоўж, і ўпоперак. Тым не менш, некаторыя сельсаветы ўжо спрабуюць упарадкаваць свае могілкі. Бо час дыктуе новыя ўмовы і правілы...

Работнікі ж Янкавіцкага сельскага Савета мяркуюць, што было б больш парадку, каб, як у Полацкім раёне, з'явілася спецарганізацыя, якая б узяла на сябе адказнасць за вясковыя могілкі. Сваякі памерлага звярталіся б туды. І спецыяльна навучаныя людзі дапамаглі б ім раздзяліць усе клопаты па пахаванні.

Разам з тым, у маленькай вёсцы, дзе ўсе адно аднаго ведаюць, мы дагэтуль па звычцы спадзяемся на разуменне і спагаду... Наіўныя, думаем, што заўсёды будзе так, як было спрадвеку... Але, хочам мы таго ці не, усё змяняецца... Як спявалі «Песняры»: «Няма таго, што раньш было...».

Яшчэ ў маім дзяцінстве, памятаю, вяскоўцы не замыкалі хату, клалі ключ пад дыванок ці наогул падпіралі дзверы дзеркачом. Цяпер жа некаторыя не тое што на дзверы, але і на вароты чапляюць замок.

Ды і вясковыя могілкі цяпер не тыя, што былі даўней. Калі раней па іх можна было прайсціся, як па роднай вуліцы, — усе вяскоўцы, якія знайшлі там свой спачын, былі знаёмыя. Дык сёння туды вязуць хаваць чужых людзей з горада. Бо на вясковых могілках гэта пакуль можна зрабіць бясплатна...

Сітуацыі бываюць розныя. Людзі бываюць розныя... На жаль, ніхто з нас не застрахаваны ад бяздушнасці, абыякавасці, бесчалавечнага стаўлення... Таму лепш перастрахавацца і, як той казаў, падкласці саломкі. Хоць бы там, дзе гэта можна зрабіць.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**


## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: ЗАО «Белреализация» (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ООО «КУБИТЕК ЖЕЛЕЗОБЕТОН»** (УНП 192626882), 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65Б, пом. 129, оф. 1409, к. № 3.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **07 декабря 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | 1/4 доля в праве собственности на изолированное помещение-машиноместо с инвентарным номером № 500/D-7026803 площадью 235,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 65Б-202 | 35 220,00 |
| 2 | 1/16 доля в праве собственности на изолированное помещение-машиноместо с инвентарным номером № 500/D-7024541 площадью 461,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул.Тимирязева,65Б-202 | 17 220,00 |
| 3 | Бетоносмесительная установка фирмы Либхерр тип Compactmix 1.0 A-R 2008 г., в комплекте бункерная сырья, сети, технологическая площадка | 430 000,00 |
| 4 | Силос для хранения цемента 90 куб. м диаметр 3 м, высота 13 м, № 21, углеродистая сталь, оборудован лестницей и датчиками наличия цемента | 21 960,00 |
| 5 | Силос для хранения цемента 90 куб. м диаметр 3 м, высота 13 м, № 22, углеродистая сталь, оборудован лестницей и датчиками наличия цемента | 21 960,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 6985353.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 27.11.2021 г. 09.00 по 06.12.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 10 дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 30.10.2021 г.

## ИНФОРМАЦИЯ о проведении **13 декабря 2021 года в 15.00** повторных аукционных торгов по продаже нежилого изолированного помещения, находящегося в собственности Борисовского района

| Сведения о предмете торгов (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества) | Начальная цена продажи, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|
| Изолированное помещение по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/19-2, инвентарный номер 610/D-56417, общая площадь – 745,2 кв. м, назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – нежилое помещение | 45 075,00 | 9 000,00 |
| **Продавец имущества:** Борисовское городское унитарное предприятие «Жильё», 222520, г. Борисов, пр-т Революции, 39, тел. +375 (177) 76-85-32 | | |
| **Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел.: +375 (17) 360-42-22 | | |
| **Срок и место приёма заявлений:** по **09.12.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 | | |
| Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского областного исполнительного комитета – **minsk-region.gov.by** (раздел Аукционы по продаже недвижимости»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Продажа/Аренда»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). | | |

УНП 190398583

## ИНФОРМАЦИЯ о проведении **30 декабря 2021 года в 11.00** аукционных торгов по продаже нежилого изолированного помещения, находящегося в собственности Борисовского района

| Сведения о предмете торгов (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества) | Начальная цена продажи, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|
| Изолированное помещение по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Краснознаменная, 58-56а, инвентарный номер 610/D-70793, общая площадь – 126,3 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – изолированное помещение | 29 900,00 | 5 900,00 |
| **Продавец имущества:** Борисовское городское унитарное предприятие «Жильё», 222520, г. Борисов, пр-т Революции, 39, тел. +375 (177) 76-85-32 | | |
| **Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел.: +375 (17) 360-42-22 | | |
| **Срок и место приёма заявлений:** по **28.12.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 | | |
| Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского областного исполнительного комитета – **minsk-region.gov.by** (раздел Аукционы по продаже недвижимости»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Продажа/Аренда»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). | | |

УНП 190398583

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
26 лістапада 2021 г. № 46 (631)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

Наталля КАЧАНАВА:

# «КАЛІ ГАВОРКА ІДЗЕ ПРА ЖЫЦЦЁ І ЗДАРОЎЕ, МЫ, БЕЛАРУСЫ, НЕ ДЗЕЛІМ ЛЮДЗЕЙ НА СВАІХ І ЧУЖЫХ»

## Беларускія парламентарыі прынялі ўдзел у Міжнароднай парламенцкай канферэнцыі

**Парламенцкая дэлегацыя Беларусі на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай прыняла ўдзел у Міжнароднай парламенцкай канферэнцыі на тэму «Усеагульны ахоп паслугамі аховы здароўя і мэты ў галіне ўстойлівага развіцця». Мерапрыемства прайшло ў фармаце відэаканферэнцыі Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў сумесна з Еўрапейскім рэгіянальным бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.**

На пачатку свайго выступлення Наталля Качанава падзякавала Старшыні Савета Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў Валянціне Мацвіенцы за ўключэнне ў парадак такой актуальнай тэмы, як «Усеагульны ахоп паслугамі аховы здароўя і мэты ў галіне ўстойлівага развіцця».

Паводле яе слоў, пандэмія, якая ахапіла ўвесь свет, прадэманстравала, наколькі важныя для кожнай краіны моцныя сістэмы аховы здароўя і гатоўнасць да дзейнасці ў надзвычайных сітуацыях. Спікер падкрэсліла: у такіх умовах крытычна неабходныя нарошчванне патэнцыялу процідзеяння новым выклікам і неадкладны пошук шляхоў для забеспячэння ўсеагульнага ахопу паслугамі аховы здароўя.

— З самага пачатку Беларусь ідзе сваім шляхам. Наш выбар мы зрабілі свядома і ўзважана, бо ўпэўнены: беларуская сістэма аховы здароўя з гэтым выклікам справіцца, — перакананa Наталля Качанава.

стар. 8

ЦІКАВЫ ВОПЫТ

# ВЯЗЫНСКІЯ КАМУНАРЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

## Пілотны сацыяльны праект пад назвай «Сезонны дом» у Вілейскім раёне прайшоў праверку часам. Хоць спачатку не ўсе верылі ў яго поспех

**ГІСТОРЫЯ стварэння ў раёне сезоннага дома для адзінокіх пенсіянераў даволі звычайная. Старшыня Вязынскага сельскага Савета Ігар СУДНІКОВІЧ згадвае, як больш за дзесяць гадоў таму яму раённыя ўлады прапанавалі ўзяцца за рэалізацыю пілотнага праекта, аналагаў якому ў Вілейскім раёне яшчэ не было — адкрыццё на зімовы перыяд часовага цёплага і ўтульнага прытулку для адзінокіх пенсіянераў вельмі сталага ўзросту.**

### Прытулак цёплы і ўтульны

Цудоўна ў вёсцы, як вядома, летам. А вось позняй восенню, зімой ды і ранняю вясной без адпаведнага рэсурсу жыццёвых сіл складана сталым людзям выконваць элементарныя хатнія справы: ваду прынесці з калодзежа, у печы прапаліць, наведаць краму ці падысці да аўталаўкі ў галалёд. Вось і ўзнікла ў мясцовай улады ідэя наладзіць у адной з вёсак сельскага Савета такі сезонны дом. Жыццё падказвала, што пры ўдалым падыходзе можна зрабіць вельмі добрую справу: дапамагчы адзінокім старым перажыць з найменшымі фізічнымі і маральнымі стратамі самы складаны сезон у іх жыцці — зімовы — прыкладна з лістапада да пачатку красавіка. Вось пад гэтыя мэты і было вырашана ў вёсцы Вязынь прыстасаваць будынак, дзе раней месціўся сельсавет, затым школа, а потым бібліятэка.

стар. 18

АКЦЭНТЫ

# «Бежанцы ўдзячныя беларускаму народу і кіраўніку дзяржавы за ўвагу»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ расказаў журналістам аб сітуацыі, якая складваецца ў лагеры бежанцаў на беларуска-польскай граніцы.**



Нагадаем, што каардынацыю дзейнасці гуманітарнай місіі па даручэнні кіраўніка дзяржавы ўзначальвае Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. У сваю чаргу Віктар Ліскові́ч каардынуе дзейнасць службаў на месцы знаходжання лагера — у ТЛЦ «Брэміна-Брузгі».

— Я тут практычна з першага дня, з першага гуманітарнага грузу, які паступіў ад Савета Рэспублікі, калі бежанцы яшчэ знаходзіліся ў лясным лагеры і атрымалі тады першыя сем тон дапамогі, — адзначыў у гутарцы з журналістамі сенатар.

Паводле яго слоў, па стане на 24 лістапада бежанцам раздадзена ўжо больш за 70 тон гуманітарнага грузу, уключаючы харчаванне і пітную ваду. Таксама на задавальненне бытавых патрэб няшчасных людзей спатрэбілася больш чым тры тысячы коўдраў, падушкі, цёплае адзенне, шкарпэткі.

Сенатар падзякаваў за дапамогу валанцёрам, а таксама арганізацыям, якія аператыўна адгукнуліся на збор гуманітарнага грузу:

— Асобна хацеў бы вылучыць акрамя Гродзенскай вобласці Брэсцкую, Гомельскую і Магілёўскую. Штодня мы атрымліваем груз і маем яго ў запасе на складзе як мінімум на два дні, — патлумачыў ён і адзначыў дзейнасць валанцёраў-перакладчыкаў, якія дапамагаюць у стасунках з бежанцамі.

Дарэчы, у якасці валанцёраў тут знаходзяцца штодня студэнты Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы: яны дапамагаюць з выдачай харчавання ў ТЛЦ, працуюць сумесна са следчымі, пагранічнікамі і медыкамі.

Каардынуючы працэс гуманітарнай місіі на месцы, Віктар Ліскові́ч падкрэсліў: беларускі бок робіць усё, каб бежанцам было камфортна.

— Асабліва хацелася б адзначыць увагу з боку кіраўніка дзяржавы. Усё трымаецца пад кантролем, і патрэбныя моманты карэктуюцца імгненна. Бежанцы ўдзячныя нашаму Прэзідэнту за ўвагу. І дзеці, і дарослыя, неадназова просяць перадаць яму цёплыя словы, — рэзюмуе ён.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# «КАЛІ ГАВОРКА ІДЗЕ ПРА ЖЫЦЦЁ І ЗДАРОЎЕ, МЫ, БЕЛАРУСЫ, НЕ ДЗЕЛІМ ЛЮДЗЕЙ НА СВАІХ І ЧУЖЫХ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Спікер верхняй палаты беларускага парламента акцэнтавала ўвагу на выніках нашай краіны ў справе дасягнення Мэт устойлівага развіцця, ахарактарызавала сучасную сістэму аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і меры, прынятыя на дзяржаўным узроўні ва ўмовах пандэміі, у тым ліку па ўсеагульным ахопе паслугамі аховы здароўя.



У прыватнасці, усеагульны ахоп паслугамі аховы здароўя на нацыянальным узроўні прадугледжаны Дзяржаўнай праграмай «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2021–2025 гады, якая падрыхтавана на аснове ключавых палажэнняў Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2035 года, праграмных дакументаў галіновага і рэгіянальнага развіцця.

— Аснову аховы здароўя нашай краіны складае дзяржаўны сектар, — адзначыла яна. — Выбудавана сістэма аператыўнага прыняцця рашэнняў, выразнага каардынавання і кантролю іх рэалізацыі на месцах. Створана разгалінаваная сетка арганізацый, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных і амбулаторна-паліклінічных умовах, маецца значны ложкавы фонд. Краіна забяспечана медыцынскімі кадрамі практыкуючага і навуковага звяна.

Спікер нагадала, што ў Беларусі функцыянуюць шматузроўневая сістэма санітарна-эпідэміялагічных службаў, інфекцыйныя бальніцы ў кожным рэгіёне.

— Пытанні процідзеяння пандэміі знаходзяцца на асабістым кантролі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава.

Яна праінфармавала прысутных аб тым, што для аператыўнага абмену інфармацыяй і неабходнага рэагавання ў кожнай вобласці і сталіцы арганізаваны штабы, якія ўзначальваюць старшыні абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў. Акрамя таго, перапрафіляванне ложкавага фонду праводзіцца ў залежнасці ад існуючай эпідэміялагічнай абстаноўкі. Прышчэпачныя пункты дзейнічаюць не толькі ў арганізацыях аховы здароўя, але і на прадпрыемствах, у гандлёвых цэнтрах, установах адукацыі, сацыяльнага абслугоўвання, працуюць выязныя брыгады. У краіне наладжана вытворчасць сродкаў індывідуальнай аховы і сродкаў дэзынфекцыі. Завяршаецца работа па лакалізацыі вакцыны «Спадарожнік V», працягваецца працэс стварэння ўласнай вакцыны.

Немалаважным фактарам лічыць Наталля Качанава і той факт, што сродкі масавай інфармацыі рэгулярна інфармуюць людзей аб мерах прафілактыкі, дзеяннях пры выяўленні сімптомаў захворвання, дзейнічаюць гарачыя тэлефонныя лініі.

— Фінансаванне мерапрыемстваў па процідзеянні пандэміі забяспечваецца дзяржавай. Нашым Прэзідэнтам прыняты рашэнні аб матэрыяльным стымуляванні медработнікаў і выдзяленні сродкаў на сістэму аховы здароўя з дзяржаўнага бюджэту і Прэзідэнцкага рэзервовага фонду. За час пандэміі толькі на медыцынскія наступствы ковід-інфекцыі затрачана парадку двух мільярдаў долараў, — паведаміла Наталля Качанава.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента адзначыла, што меры, якія прымаюцца ў краіне, дазваляюць забяспечваць магчымасць кіраваць эпідэміялагічнай сітуацыяй і нават у гэтых умовах прадстаўляць грамадзянам роўны і свабодны доступ да паслуг аховы здароўя незалежна ад месца пражывання, полу, узросту.

— Арганізацыі аховы здароўя Беларусі працягваюць аказваць экстранную і неадкладную дапамогу, у поўным аб'ёме выконваць планавае медыцынскае абслугоўванне ажно да правядзення высокатэхналагічных аперацый, — кажа спікер верхняй палаты парламента.

Яна падкрэсліла: пад пільнай увагай дзяржавы знаходзяцца асобныя катэгорыі насельніцтва. У прыватнасці, для людзей пажылога ўзросту, людзей з інваліднасцю забяспечана медабслугоўванне ў хатніх умовах: пачынаючы ад прыёму аналізаў да кансультацый урачоў-спецыялістаў і дастаўкі рэцэптаў. Не спыняецца таксама аказанне акушэрска-гінекалагічнай і перынатальнай медыцынскай дапамогі. Дакладна выбудавана сістэма дапамогі маці і дзецям.

Акрамя таго, вядзецца будаўніцтва і рэканструкцыя аб'ектаў аховы здароўя, аснашчэнне арганізацый сучасным высокатэхналагічным медыцынскім абсталяваннем.

Нагадаем, што зусім нядаўна ў Мінскім навукова-практычным цэнтры хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі завершана будаўніцтва шматпрофільнага хірургічнага корпуса з інтэлектуальнымі аперацыйнымі. У Магілёве адкрыліся кардыялагічны цэнтр і «разумная паліклініка» для дзяцей і дарослых.

Наталля Качанава расказала, што дзейснасць і мабільнасць нашай сістэмы аховы здароўя чарговы раз пацвярджаюцца ў сітуацыі на беларуска-польскай граніцы:

— Мы занепакоеныя становішчам бежанцаў, асабліва цяжарных жанчын, дзяцей, людзей сталага ўзросту. Калі гаворка ідзе пра жыццё і здароўе, мы, беларусы, не дзелім людзей на сваіх і чужых, — падкрэсліла спікер верхняй палаты беларускага парламента. — Са свайго боку мы робім усё неабходнае для гэтых людзей, уключаючы пастаянны маніторынг брыгадамі медыцынскай дапамогі, медыцынскія агляды і кансультацыі, пры неабходнасці праводзіцца шпіталізацыя, прапанавана вакцынаванне для ахвотных. Аднак відавочна: неабходныя рашэнні палітычнага характару на міжнародным узроўні.

Яна адзначыла, што ўвага, якая ўдзяляецца дзяржавай сістэме аховы здароўя, прыносіць добрыя вынікі. У тым ліку па дасягненні прагрэсу ў рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця.

У якасці пацвярджэння сваіх слоў Старшыня Савета Рэспублікі прыводзіць высокія пазіцыі Беларусі ў міжнародных сістэмах ацэнак: у рэйтынгу Мэт устойлівага развіцця — 24-е месца, па індэксе чалавечага развіцця — 53-е месца, узровень прагрэсу Беларусі па дасягненні Мэт складае амаль 80 %.

Спікер акцэнтавала ўвагу на тым, што найвышэйшую ацэнку беларускай сістэмы аховы здароўя даюць і прадстаўнікі Еўрапейскага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у тым ліку па выніках нядаўняга візіту ў нашу краіну.

— Беларусь заўсёды гатова дзяліцца сваім вопытам. Мы адкрыты да самага шырокага супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі партнёрамі ў інтарэсах стабільнага, здаровага і квітнеючага свету, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Добрым прыкладам з'яўляецца наша цеснае канструктыўнае ўзаемадзеянне з Расіяй і Кітаем у барацьбе з ковід-інфекцыяй.

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, як беларускі бок без прамаруджвання накіраваў гуманітарную дапамогу кітайскаму народу, які першы сутыкнуўся з пандэміяй.

— У сваю чаргу нашы стратэгічныя партнёры Расія і Кітай дапамагаюць супрацьстаяць гэтаму выкліку. І мы ўдзячныя ім за гэта, — адзначыла Наталля Качанава.

Яна падкрэсліла: ва ўмовах распаўсюджвання інфекцыйных хвароб у сучасным глабалізаваным свеце краіны не могуць дзейнічаць паасобку. Пасяхова супрацьстаяць падобным выклікам магчыма толькі ў рамках адзінага міжнароднага падыходу.

— Разам мы павінны стварыць сістэму паўнавартаснага забеспячэння пандэмічнай гатоўнасці і рэагавання, якая здольная забяспечыць бяспеку і здароўе людзей. У прыярытэце — усталяванне ўстойлівых кантактаў і абмен найлепшымі практыкамі для дасягнення мэт устойлівага развіцця і процідзеяння пандэміі COVID-19, — перакананая Старшыня Савета Рэспублікі.

Паводле яе слоў, задача парламентарыяў — у стварэнні надзейнай і празрыстай заканадаўчай базы для рэгулявання механізмаў рэагавання і забеспячэння эфектыўнага прымянення законаў у сферы надзвычайных сітуацый у галіне аховы здароўя. Спікер звярнула ўвагу на неабходнасць ажыццяўлення пастаяннага абмену парламенцкімі практыкамі і развіцці міжпарламенцкіх сувязяў па гэтых пытаннях.

— Наш агульны абавязак перад цяперашнім і будучымі пакаленнямі — не дапусціць новых эпідэмій і пандэмій. Няхай COVID-19 будзе апошняй пандэміяй у гісторыі чалавецтва, — рэзюмавала Наталля Качанава.

На пленарным пасяджэнні канферэнцыі таксама выступілі Старшыня Савета Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД, Старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Валянціна Мацвіенка, дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Ханс Клюге, кіраўнікі парламенцкіх дэлегацый, кіраўнікі профільных галіновых саветаў СНД, міністэрстваў і ведамстваў дзяржаў — удзельніц СНД, кіраўнікі партнёрскіх міжнародных арганізацый і прадстаўнікі экспертнай супольнасці.

У рамках канферэнцыі таксама прайшлі пасяджэнні панэльных дыскусій па тэмах «Роля парламентаў у заканадаўчым забеспячэнні права на доступ да паслуг грамадскай аховы здароўя і медыцынскай дапамогі ва ўмовах пандэміі» і «Права на ўсеагульны ахоп паслугамі аховы здароўя: усеагульны доступ да якаснай медыка-санітарнай дапамогі і абарона ад фінансавых рызык».

***

**У другой палове дня Старшыня Савета Рэспублікі, член Савета Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў Наталля Качанава прыняла ўдзел у пасяджэнні Савета МПА СНД.**

На парадку дня пасяджэння Савета — 23 пытанні. Наталля Качанава праінфармавала членаў Савета аб ходзе рэалізацыі старшынства Рэспублікі Беларусь у Садружнасці Незалежных Дзяржаў летась.

Яна адзначыла ключавыя мерапрыемствы вышэйшага і высокага ўзроўняў, галіновыя мерапрыемствы, праведзеныя ў рамках старшынства, прынятыя рашэнні і дасягнутыя дамоўленасці.

Асаблівы акцэнт зроблены на неабходнасці падтрымкі партнёраў па Садружнасці, адстойванні прынцыповай пазіцыі і агульных падыходаў ва ўмовах знешняга ціску, нядобрасумленнай канкурэнцыі, прадузятага стаўлення, эканамічных і палітычных абмежаванняў.

— Далейшае ўмацаванне СНД, пашырэнне нашага ўзаемадзеяння ва ўсіх магчымых фарматах, выступленне з адзіных пазіцый і ўзаемная падтрымка на міжнародных пляцоўках дапамогуць справіцца з рызыкамі і пагрозамі нацыянальнай, рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі. Толькі сумеснай, суладнай працай усіх дзяржаў і структур СНД можна дасягнуць пастаўленых мэт, — падкрэсліла Наталля Качанава.

У рамках пасяджэння ўдзельнікі абмеркавалі пытанні міжнароднага назірання за выбарамі і рэферэндумамі ў асобных дзяржавах — удзельніцах СНД. Зацверджаны старшыні пастаянных камісій, намечаны план работы асамблеі на 2022 год.

На мерапрыемстве члены Савета падвялі вынікі праведзеных у 2021 годзе мерапрыемстваў: дзявятага Неўскага міжнароднага экалагічнага кангрэса, трэцяга Еўразійскага жаночага форуму, VI Міжнароднага культурна-адукацыйнага форуму дзяржаў — удзельніц СНД «Дзеці Садружнасці».

Удзельнікі пасяджэння таксама абмеркавалі падрыхтоўку да Сусветнай канферэнцыі па міжкультурным і міжрэлігійным дыялогу, якая арганізоўваецца міжпарламенцкім саюзам у супрацоўніцтве з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і пройдзе ў маі будучага года ў Санкт-Пецярбургу з удзелам кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, кіраўнікоў парламентаў і рэлігійных дзеячаў, а таксама прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і моладзі.

Дарэчы, у 2022 годзе МПА СНД адзначае сваё 30-годдзе. У сувязі з гэтым Саветам заснаваны юбілейны медаль «МПА СНД. 30 гадоў» і памятны знак «МПА СНД. 30 гадоў».

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота БелТА.**

**У тэму**

**Таксама ў фармаце відэаканферэнцыі прайшло чарговае пасяджэнне Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД па эканоміцы і фінансах.**

На ім старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ была пераабрана намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД па эканоміцы і фінансах.

# «X-FACTOR У БЕЛАРУСІ»: ФІНАЛ БЛІЗКА

**У мінулыя выхадныя музычнае шоу «X-Factor у Беларусі» выйшла на стадыю прамых эфіраў. 14 харызматычных маладых артыстаў пачалі прэзентаваць сябе настаўнікам праекта і тэлеаўдыторыі ў новых вобразах.**



І цяпер з выпуску ў выпуск будуць заставацца тыя, за каго галасуюць гледачы. Калі раней таленавітым людзям трэба было пераконваць строгіх настаўнікаў у тым, што яны заслугоўваюць месца ў праекце, то цяпер усё стала складаней. Як у папярэднім, так і ў наступных live-канцэртах адшукваць фактар «ікс» у адным з удзельнікаў будуць і гледачы. Па традыцыі франшызы не абыходзяцца і без зорных гасцей. А вось з пераможцамі будзем вызначацца ўжо напярэдадні Новага года. Тым часам, пасля першага прамога эфіру праект пакінулі два ўдзельнікі і цяпер засталося толькі 12 прэтэндэнтаў на перамогу. Думаю, самы час і нам вызначыцца з фаварытамі, каб падтрымаць іх на такім адказным этапе творчых спаборніцтваў. Нагадаем, што ў камандзе музычнага крытыка і журналіста Сяргея Саседава барацьбу працягваюць Карына Ярафеева, Дзяніс Пацэвіч і Анастасія Краўчанка. У Руслана Аляхно засталіся толькі два прэтэндэнты — Яўген Вярэніч і Ніколь Фургал, а вось Віталь Дроб выбыў з шоу. Разам з Вольгай Бузавай далей працягнуць удзел у праекце Вікторыя Паплеўчынкава, Дзмітрый Кексаў, Андрэй Панісаў і Мікіта Бялько. А ў складзе каманды прадзюсара і выканаўцы Сярогі будуць «запальваць» публіку Марына Бараноўская, Фахрыдзін Хакімаў і Анэта Капба ўжо без эпатажнага Арцёма Чыркова. За тым, як складуцца іх лёсы на праекце, сачыце на «Беларусь 1» і ў сацыяльных сетках, таксама ў дзённіках шоу, сюжэтах карэспандэнтаў Агенцтва тэленавін і праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!» і ў эфіры радыёстанцый Белтэлерадыёкампаніі.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

(«Звязда»)

Выпуск № 153

З 15 да 21 лістапада ў Картрэйку (Бельгія) праходзіў чэмпіянат Еўропы па шашках-100 сярод моладзі да 27 гадоў. Нашу краіну прадстаўлялі Яна Якубовіч, Паліна Петрусёва і Дзмітрый Немец. Беларускія шашысты зрабілі залаты дубль у класічнай праграме. Чэмпіёнамі Еўропы сталі Яна Якубовіч і Дзмітрый Немец. Яшчэ адзін медаль — сярэбраны — на рахунку Паліны Петрусёвай.

**№ 134**



**№ 134** Міхаіл Левандоўскі (Украіна)

**Белыя простыя шашкі:** g1, c3, e3, d4, a5, e5 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, f6, a7, c7, g7, b8 (6)

**№ 135** Віталь Варушыла

**Белыя простыя шашкі:** e1, d2, f2, e3, f4, g5, c7, g7 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, h2, b4, h4, h6, e7, f8, h8 (8)

**№ 135** Нішан Алавердзян (Ерэван, Арменія)

**Белыя простыя шашкі:** c3, b4, c5, b6, белыя дамкі: a7 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** g3, g5, e7, g7, чорныя дамкі: f2 (5)

**№ 136** Барыс Іваноў

**Белыя простыя шашкі:** 41, 43, 37, 39, 24, 15 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** 36, 32, 28, 22, 23, 25, 11 (7)

**№ 137** Вадзім Булат (Мінск)

**Белыя простыя шашкі:** 49, 41, 38, 39, 30, 24, 25 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 36, 40, 27, 28, 18, 11, 13, 9 (8)

**№ 138** В. Булат

**Белыя простыя шашкі:** 48, 49, 31, 30, 24, 25, 17 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 39, 35, 18, 15, 7, 8, 9 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Выпуск № 152 ад 12.11.21.

№ 132 1. 19-13 28:39 2. 37:08 15:33 3. 13:04 02:13 4. 04:34 33-38 5. 34-48+

№ 133 1. 19-13 28:48 2. 13:04 15:33 3. 04:04 17:26 4. 41-37 48:31 5. 04:36+ Поўнае пабочнае рашэнне: 1. 23-18 12:25 2. 21:1 22-27 (лепшае) 3. 1-6 27-31 (лепшае) 4. 6:44 32-37 5. 41:32 31-36 6. 44-33 36-41 7. 34-30 25:23 8. 24-20 15:24 9. 33:47 x знайшоў С. Бурко з Оршы.

Першыя дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», г . Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Ці ўсё мы ведаем пра майстроў і куміраў?

**У эфіры тэлеканала «Беларусь 3» да дня нараджэння класіка Уладзіміра Караткевіча (26 лістапада) падрыхтавалі тэматычны эфір. Таксама святочны акцэнт тут зробяць на юбілейныя даты народнай артысткі Беларусі Марыі Захарэвіч і савецкага кампазітара Аляксандра Зацэпіна.**



Пра Уладзіміра Караткевіча, здаецца, усе мы ведаем ужо не так і мала, але заўсёды карысна і цікава аднавіць у памяці гісторыю яго жыцця, а можа, і разгледзець раней невядомыя старонкі асабістай ці літаратурнай біяграфіі. Таму прыхільнікам творчасці пісьменніка, перакладчыка, крытыка Уладзіміра Караткевіча варта паглядзець выпускі тэматычных праектаў. Пра майстра слова будуць распавядаць у аўтарскай праграме Уладзіміра Арлова «Люблю і памятаю» 26 лістапада, і ў «Запісках на палях». Уладзімір Караткевіч: трафей «Дзікага палявання» — 27 лістапада. А для тых, каму падабаецца ўвасабленне літаратурных твораў у кіно альбо на тэатральнай сцэне, на сацыякультурным тэлеканале зладзяць паказ спектакля «Леаніды не вернуцца на зямлю» Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа.

У нядзельным эфіры 28 лістапада «Беларусь 3» аўдыторыю чакае выпуск праграмы «Майстры і куміры», прысвечаны 85-годдзю актрысы, педагога, народнай артысткі БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Марыі Захарэвіч. ...Таленавітая дзяўчына з Мядзельскага раёна Міншчыны ў свой час пасля заканчэння вучобы была залічана ў трупу Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, дзе ўвасобіла дзясяткі яркіх роляў. Сярод яе сцэнічных вобразаў — Ганна («Людзі на балоце» І. Мележа), Паліна Іванаўна («Апошні шанц» В. Быкава), Алена («Дзеці сонца» М. Горкага) і шэраг іншых. Сярод кінафільмаў у яе творчай біяграфіі значацца такія стужкі як, напрыклад, «Чужая бацькаўшчына», «Руіны страляюць...», «Я, Францыск Скарына...». Акрамя таго, Марыя Георгіеўна вядомая і як выкладчык сцэнічнай мовы ў Беларускім універсітэце культуры. А ў фондах Беларускага радыё захоўваюцца сотні радыёпастановак і іншых матэрыялаў з удзелам артысткі. Адзначылася яна і як рэжысёр спектакляў «Апошняя ахвяра» паводле Астроўскага, «Характары» паводле Шукшына, эксперыментальнай пастаноўкі «Я не пакіну цябе». Таму не прапусціце чарговы выпуск праграмы «Майстры і куміры», каб бліжэй пазнаёміцца з гэтай таленавітай актрысай.

**23.45** «Сутэнёр» (16+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.45** «Залатая кроў» (12+).
**9.45** «Паглядзім» (12+).
**10.25** «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
**11.50** «Знакі лёсу» (16+).
**12.30, 18.00, 1.40** «Сляпая» (16+).
**13.35, 19.10, 2.40** «Варажбітка» (16+).
**14.45, 5.05** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.55, 0.45** «Містычныя гісторыі» (16+).
**17.00, 23.05** «Якія вярнуліся» (16+).
**20.20** «Любоўная магія».
**22.00** «Гучныя справы» (16+).
**0.10** «Хопіць чутак». (16+).
**3.35** «Суд ідзе». Серыял (16+).

### ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.15, 18.05** Элементарна (16+).
**6.45** Нецалаваная (16+).
**8.45** У метры адзін ад аднаго (16+).
**11.00** Вінаватыя зоркі (12+).
**13.15** Веру ў каханне (12+).
**15.20** Шчаслівы выпадак (12+).
**19.00** Шоу Трумана (6+).
**20.50** Оптам танней (12+).
**22.35** Оптам танней-2 (12 +).
**0.15** Дваццаць адно (16+).
**2.35** Абуджэнне (6+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.30** Крывавая лэдзі Баторы (16+).
**8.15** Метро (16+).
**10.40** Блаславіце жанчыну (12 +).
**12.55** Блокбастар (16+).
**14.25** Давай развядзёмся! (12+)
**16.10, 17.05, 18.00, 18.55** За гадзіну да світанка (16+).
**19.45** Чарнобыль (12+).
**22.15** Экіпаж (6+).
**0.45** Землятрус (12+).
**2.30** Параграф 78: фільм першы (16+).
**3.55** Параграф 78: фільм другі (16+).

### National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.25, 6.50** Гульні розуму (16+).
**7.20, 8.10** Панарама 360 (16+).
**9.05** 2000-я: час, калі мы ўбачылі ўсё (16+).
**9.45** Ледзяная дарога (16+).
**10.40, 11.30** Дзікі тунец (16+).
**12.20, 16.40** Нязведаныя воды з Джэрэмі Уэйдам (16+).
**13.10, 14.00** Аўта-SOS (16+).
**14.55, 19.15, 20.05, 2.50** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**15.50** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**17.30** Інстынкт выжывання (16+).
**18.25, 18.50** Фабрыка ежы (16+).
**21.00** Найбуйнейшыя тэхнагенныя катастрофы (16+).
**21.50** Падымаецца бура (16+).
**22.40** Недаследаваныя глыбіні (16+).
**23.35** Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
**00.30** Настольная кніга дыктатара (16+).
**1.20, 2.05** Ліхтугі за мяжой (16+).
**3.35** Найбуйнейшыя тэхнагенныя катастрофы (16+).
**4.25, 4.50** Зона будаўніцтва (16+).
**5.15, 5.40** Вар'яцкія вынаходкі (16+).

### Discovery

**8.00, 7.35** Як гэта зроблена? (12+)
**8.25, 11.10, 16.40, 22.10** Махінатары (16+).
**9.20, 20.20, 20.45** Паляўнічыя на склады (16+).
**10.15, 10.40, 21.15, 21.40, 1.50** Як гэта ўстроена? (12+)
**12.05, 13.00** Залатая ліхаманка (16+).
**13.55** Багажныя войны (12+).
**17.35** Падарожжа ў невядомасць з Эдам Стафардам (16+).
**18.30, 18.55** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**19.25, 4.27** Хуткія і гучныя (16+).
**23.05, 5.14** Аляска: сям'я з лесу (16+).
**0.00, 6.01** Аляска: апошняя мяжа (12+).
**0.55, 6.48** Паляўнічыя на дыназаўраў (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.25** Зона Х. (16+).
**9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).**
**10.50** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Іншыя» (16+).**
**14.00** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.45, 15.25 Драма «Замак з пяску» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часіна.
**21.00** Панарама.
**21.45** Адзін дзень (12+).
**0.10** Сфера інтарэсаў.
**0.45** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 17.55** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.10, 0.35** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.15, 22.15 Серыял «Сышчык-3» (16+).**
**13.25** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**14.00, 21.15 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).**
**14.55** «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**16.55** «Вежа» (12+).
**18.00** «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
**18.55 «Клон». Серыял (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49 , КЕНА.

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 19.40, 23.30** Навіны культуры.
**8.25, 18.05** «Легенды кіно» (12+) [СЦ].
**9.00, 16.40 «Зайчык». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.25** «Вызваленне» (12+).
**10.50, 18.40 «Жукаў». Шматсерыйны маст. фільм (16+) [СЦ].**
**11.45** «Крылы Перамогі».
**12.50** «Сваімі словамі».
**13.30, 21.05 «Строгавы». Шматсерыйны маст. фільм (12+) [СЦ].**
**15.55 «Зельдовіч. Тэорыя гарэння і выбуху». Гісторыка-біяграфічны фільм (12+) [СЦ].**
**20.00** «Кафедра».
**20.10** «Жывая спадчына».
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.15** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Элверум» (Нарвегія) — «Мяшкоў-Брэст» (Беларусь).
**8.45** Між іншым.
**9.05** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Дынама-Мінск».
**11.00** Гандбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Іспанія — Аргенціна.
**12.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Ліверпуль».
**14.30** Плаванне. Ліга ISL.
**15.35, 21.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**17.00** Фігурнае катанне. Гран-пры.
**18.20** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**19.50** Гандбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Германія — Чэхія.
**22.55** Спорт-цэнтр.
**23.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Арсенал».

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.05** Нашы навіны.
**9.10** «Аб'ектыўНа» (16+).
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 23.10 Фільм «Усё да лепшага» (12+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.15** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**21.55 «Вярцінскі». Фільм (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.05** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**10.00** «Глядзець усім!» (16+)
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.25, 21.00, 0.55** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 21.50** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.45, 16.50 «Ленінград-46». Серыял (16+).**
**20.30, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45** «Міншчына».

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Радня» (12+).**
**6.30, 10.10, 22.10 Серыял «Меч» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 16.20, 18.00** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.10** «Слабае звяно» (12+).
**21.10** «Назад у будучыню» (16+).
**2.15, 3.15** Мір. Меркаванне (12+).
**2.30** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**2.40** «Даслоўна» (12+).
**2.50** «Еўразія. Рэгіёны» (12+).
**3.30** «5 прычын застацца дома» (12+).
**3.40** «Культ асобы» (12+).
**3.50** «Нашы замежнікі» (12+).

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35, 14.35 Серыял «Кулагіны» (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.40** «Кропкі над і» (16+).
**17.15** «60 хвілін» (12+).
**18.30** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Ключ ад усіх дзвярэй» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.05, 8.20, 16.35, 19.50, 22.20, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.10** Спорт-мікс.
**6.20** «Здароўе» (12+).
**7.20** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 22.25** «НЗ.by».
**8.55** Пракурорская праверка (16+).
**10.25 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**12.10, 13.45 Серыял «Ляснік. Свая зямля» (16+).**
**13.20** Надзвычайнае здарэнне.
**16.45** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**17.00** «За гранню» (16+).
**17.55** «ДНК» (16+).
**20.05 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**21.15, 22.45, 23.45 Серыял «Гарачая кропка» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 13.50, 16.30, 21.05, 1.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад (6+).
**7.30, 13.55, 20.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Героі» (16+).**
**8.15 Серыял «Тэрмінатар. Бітва за будучыню» (16+).**
**9.00 Серыял «Бразілія».**
**9.45 Фільм «Адзінокі рэйнджар» (12+).**
**12.15 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**13.40** Мультпарад. «Лэдзі Баг і Супер Кот» (6+).
**14.00** «Хачу ў Парыж» (12+).
**14.05 Серыял «Супермен і Лоіс» (16+).**
**14.50 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).**
**16.35 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).**
**17.15** «7 цудаў».
**17.50 Драма «Здрада» (16+).**
**19.10 Серыял «Вікторыя».**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Лоўрэнс Аравійскі» (12+).**



## ВТБ

**6.05, 7.00, 9.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**11.00, 22.30** «КВЗ. Панашаму» (16+).
**12.00** «Гатуем як шэф» (16+).
**12.35** «Дурні і дарогі» (16+).
**12.50** Баявік «16 кварталаў» (12+).



**14.50, 17.00** «Уральскія пельмені» (16+).
**15.55** Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
**18.30** Серыял «Гранд» (16+).
**20.00** Серыял «Бацькам» (16+).
**21.00** «Форт Баярд» (16+).
**23.30** Трылер «Схватка» (16+).
**1.55** Серыял «Метад Лаўровай» (16+).
**3.45** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**4.35** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 18.35, 1.05** «Асаджаныя крэпасці. Легендарныя бітвы». Дак. фільм [СЦ].
**8.35** Колер часу.
**8.45, 16.40** «Мелодыя на два галасы». Маст. фільм [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.00** ХХ стагоддзе.
**12.20** «Маршал Жукаў. Памяць». Дак. фільм [СЦ].
**13.05** Раман у камені [СЦ].
**13.35** «Сучаснік свайго дзяцінства». Дак. фільм.
**14.05, 22.15** «Імя ружы». Серыял.
**15.05** Навіны. Падрабязна. Тэатр.
**15.20** Пернікавы домік [СЦ].
**15.50** «2 Вернік 2».
**17.55** «Вераніка Дударава. Сваю біяграфію я малявала сама». Дак. фільм.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Адкрытая кніга [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Касмічны рэйс. Місія на Марс». Дак. фільм [СЦ].
**21.30** «Энігма. Ігар Галаваценка».
**23.10** «Зоя Багуслаўская. Мае людзі» [СЦ].
**1.55** «Сяргей Дарэнскі. Аб часе і аб сабе». Дак. фільм.
**2.40** Pro memoria. «Венецыянскае шкло».

## Настальгія

**6.00** «Быў час» (16+).
**6.55** Маст. фільм «Амерыканскі дзядуля» (18+).
**8.15** «Па той бок рампы» (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.00, 14.20, 15.40, 21.40, 23.00, 1.15, 2.45, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**13.05** Маст. фільм «Сяброўка мая» (18+).
**17.00** «Рок і вакол яго» (16+).
**18.00** «Яловая субмарына» (16+).
**18.50** «Пад знакам задыяка. Рыбы» (18+).
**20.25** Рытмічная гімнастыка (12+).
**0.00** «СевАлогія» (18+).
**1.25** Маст. фільм «Матылькі» (18+).

## EuroSport 1

**1.30, 19.50, 21.45** Снукер. UK Championship (6+).
**2.30, 12.30** Тэлечасопіс GolfTV Weekly (6+).
**3.00, 17.00** Горныя лыжы. КМ. Жанчыны (16+).
**3.30, 15.35** Біятлон. КМ. Жанчыны (6+).
**4.15, 18.30** Біятлон. КМ. Мужчыны (6+).
**8.00, 8.30** Лыжнае дваябор'е. КМ. Мужчыны (16+).
**9.00, 10.00** Лыжныя гонкі. КМ. Жанчыны (6+).
**10.30, 12.25** Навіны (16+).
**13.00** Веласпорт-трэк. ЛЧ (16+).
**15.05** Тэлечасопіс Eurosport Winter Pass#2 (16+).
**17.30** Фрыстайл. КМ.

## Кінакамедыя

**0.50** «Выдатная эпоха» (18+).
**3.00** «Аднакласніцы» (16+).
**4.30** «Чаго хоча Джульета» (16+).



**6.15** «Легенда Зора» (6+).
**8.40** «Ружовая пантэра» (12+).
**10.20** «Ружовая пантэра-2» (12+).
**12.05** «Дзевяць ярдаў-2» (16+).
**13.55** «Васабі» (16+).
**15.40** «1+1» (16+).
**17.45** «Сутэнёр» (16+).
**19.30** «Вельмі небяспечная штучка» (16+).
**21.05** «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу» (16+).
**22.45** «Модная штучка» (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.55** «Залатая кроў» (12+).
**9.50** «Улегцы» (12+).
**10.35** «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
**12.10** «Знакі лёсу» (16+).
**12.50, 18.00, 2.00** «Сляпая» (16+).
**14.00, 19.10, 3.00** «Варажбітка» (16+).
**15.10, 5.30** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.15, 1.05** «Містычныя гісторыі» (16+).
**17.20** «Любоўная магія».
**20.20** «Інсамнія» (16+).
**21.30** «Ганебная радня». Дак. фільм (16+).
**22.30** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**0.30** «10 самых» (16+).
**3.55** «Суд ідзе». Серыял (16+).

## ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.15, 18.05** Элементарна (16+).
**6.45** Чатыры пёры (16+).
**9.05** Баявы конь (12+).
**11.45** Як прыручыць дракона (12+).
**13.25** Джэк — пакарыцель веліканаў (12+).
**15.30** Сёмы сын (16+).
**19.00** У метры адзін ад аднаго (16+).
**21.10** Вінаватыя зоркі (12+).
**23.25** Веру ў каханне (12+).
**1.35** Шчаслівы выпадак (12+).
**3.10** Мост у Тэрабіцію (6+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.10** Метро (16+).
**7.15** Світанак (16+).
**9.00** Уцёкі (16+).
**11.10** Чарнобыль (12+).
**13.35** Метро (16+).
**16.00, 17.00** Нюхач (16+).
**18.00, 18.55** За гадзіну да світанка (16+).
**19.50** Адмірал (16+).
**22.05** Блаславіце жанчыну (12+).
**0.15** Крывавая лэдзі Баторы (16+).
**2.05** Блокбастар (16+).
**3.20** Давай развядзёмся! (12+)
**4.50** Каханне з акцэнтам (16+).

## National Geographic

**6.00** Гульні розуму (16+).
**6.30, 7.20** Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
**8.10** 2000-я: час, калі мы ўбачылі ўсё (16+).
**9.05** Ледзяная дарога (16+).
**9.55, 10.50** Дзікі тунец (16+).
**11.40, 16.20** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**12.50, 13.40** Аўта-SOS (16+).
**14.35, 19.15, 20.05, 2.50** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**15.25** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**17.30** Інстынкт выжывання (16+).
**18.25, 18.50** Фабрыка ежы (16+).
**21.00, 3.35** Нязведаныя воды з Джэрэмі Уэйдам (16+).
**21.50** Падарожжы з Гарданам Рамзі (16+).
**22.40** Недаследаваныя глыбіні (16+).
**23.35** Таямніцы космасу (16+).
**0.30** Настольная кніга дыктатара (16+).
**1.20, 2.05** Ліхтугі за мяжой (16+).
**4.25, 4.50** Зона будаўніцтва (16+).
**5.15, 5.40** Вар'яцкія вынаходкі (16+).

## Discovery

**8.00, 7.35** Як гэта зроблена? (12+)
**8.25, 11.10, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**9.20, 20.20** Паляўнічыя на склады (16+).
**10.15, 10.40, 13.55, 21.15, 21.40** Як гэта ўстроена?
**12.05** Голыя і напалоханыя (16+).
**17.35** Эд Стафард: які выжыў. Панама (16+).
**18.30, 18.55** Кафэ, закусачная і забягалаўкі (12+).
**19.25, 4.27** Хуткія і гучныя (16+).
**23.05, 0.00, 0.55, 5.14, 6.01, 6.48** Залатая ліхаманка (16+).
**1.50** Багажныя войны (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліюецца са скрытымі субцітрамі.*

СПАЖЫВЕЦ

# ШТО ПАЧЫМ?

## Сенатары зноў адправяцца ў рэйды па крамах і аптэках

**На працягу наступнага тыдня члены Савета Рэспублікі будуць маніторыць ваганні цэн на сацыяльна значную групу прадуктаў харчавання і цэны на лекі ў аптэках.**

Нагадаем, што год таму Прэзідэнт паставіў перад парламентарыямі задачу далучыцца да маніторынгу цэн на прадукты харчавання і лекі. Сенатары актыўна ўключыліся ў работу, ахапіўшы аб'екты гандлю і аптэкі па ўсёй краіне. Перыядычна па выніках гэтых маніторынгаў факты неабгрунтаванага завышэння цэн адпраўляюцца ў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ) і Міністэрства аховы здароўя.

> «Не сакрэт, што ў свеце, па даных ААН, каля 9 % насельніцтва пакутуюць ад голаду і недахопу ежы. Таму харчовая бяспека краіны на першым месцы».

Як расказала **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ**, штомесяц сенатары ва ўсіх рэгіёнах, дзе яны пражываюць, выходзяць на маніторынг цэн. Ахоплена 117 гандлёвых аб'ектаў 28 гандлёвых сетак.

— Падчас маніторынгу звяртаецца ўвага на наяўнасць тавараў, каб не было ажыятажу і дэфіцыту, кантралююцца цэны, якія прапануюць гандлёвыя сеткі і вытворцы. Пры выяўленні фактаў завышэння цэн уся інфармацыя накіроўваецца ў МАРГ для прыняцця мер рэагавання, — кажа яна.

Сенатар адзначае шчыльнае ўзаемадзеянне з МАРГ у гэтым пытанні:

— За 10 сёлетніх месяцаў выпісана 217 прадпісанняў аб парушэннях нарматыўных актаў па цэнаўтварэнні, 208 службовых асоб прыцягнуты да адказнасці, у бюджэт пералічана каля 900 тысяч рублёў, — патлумачыла Таццяна Рунец.

Суразмоўніца адзначыла, што члены Савета Рэспублікі аналізуюць цэны не толькі на прадукты харчавання і першай неабходнасці, але і на іншыя тавары.

— Мы бачым рост, але ён заўсёды аналізуецца, высвятляюцца яго прычыны, — падкрэсліла яна і звярнула ўвагу на сітуацыю, якая склалася на сусветных рынках. — Па даных ААН, рост цэн на раслінныя алеі з пачатку года дасягае 70 %, на цукар — 38 %, мяса — 20 %. Гэта дастаткова вялікія лічбы, якія аказваюць уплыў і на цэны ў нашай краіне.

У прыватнасці, па ацэнцы МАРГ, за год гародніна стала даражэйшая на 24,8 %, малако і малочныя прадукты — на 7,7 %, крупы і бабовыя — на 6,1 %. Спецыялісты канстатуюць: павышаны рост цэн на прадукты харчавання абумоўлены негатыўнымі тэндэнцыямі на знешніх рынках. Падчас пандэміі ў многіх краінах скарацілася вытворчасць сыравіны. Лакдаўн і каранцін прывялі як да абмежавання вытворчасці, так і распаўсюджання гатовай прадукцыі. У сувязі з аднаўленнем эканамічнага росту пастаўшчыкі не паспяваюць за ўзрослым попытам, што вядзе да павышэння цэн.

Так, харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН паведамляе, што восенню 2021 года сусветныя цэны на харчаванне дасягнулі найбольш высокага паказчыка за апошнія 10 гадоў — гадавы прырост склаў у кастрычніку 29,3 %, у Расіі прадукты харчавання за год сталі даражэйшымі на 12,1 %, гародніна — на 48,6 %.



— Таму Прэзідэнт ставіць задачу, каб урад і вытворцы неабгрунтавана не павышалі цэны, каб грамадзяне з невялікім заробкам мелі магчымасць набыць тавары першай неабходнасці, — падкрэсліла Таццяна Рунец.

Сенатар адзначае і важнасць забеспячэння харчовай бяспекі краіны:

> «За 10 сёлетніх месяцаў выпісана 217 прадпісанняў аб парушэннях нарматыўных актаў па цэнаўтварэнні, 208 службовых асоб прыцягнуты да адказнасці, у бюджэт пералічана каля 900 тысяч рублёў».

— Не сакрэт, што ў свеце, па даных ААН, каля 9 % насельніцтва пакутуюць ад голаду і недахопу ежы. Таму харчовая бяспека краіны на першым месцы, — кажа яна.

Другі сегмент, які знаходзіцца ў фокусе ўвагі парламентарыяў, — маніторынг цэн у аптэках:

— Гэта таксама вельмі важны сегмент, — перакананa старшыня профільнай камісіі. — Ахоплена каля 400 найменняў у аптэчнай сетцы.

Паводле яе слоў, сенатары адзначаюць несістэмнасць збоі ў пастаўках лекаў беларускіх вытворцаў. У такім выпадку Савет Рэспублікі ўзаемадзейнічае з Міністэрствам аховы здароўя і высвятляе прычыны.

— Таксама грамадзяне звяртаюць увагу на розніцу цэн у розных аптэках. Тут мы стараемся патлумачыць, што цана ў аптэцы залежыць ад многіх фактараў і ёсць магчымасць набыць лекі ў іншай аптэцы, дзе тавар таннейшы. Акрамя таго, аптэчныя сеткі выкарыстоўваюць сістэму зніжак. У прынцыпе, цэны ў аптэках не выклікаюць у нас вялікіх нараканняў, у асноўным там парушэнняў няма, — кажа сенатар.

Яна расказала, што па даручэнні Старшыні Савета Рэспублікі ў перыяд з 30 лістапада да 3 снежня запланавана правядзенне чарговага рэйду па крамах і аптэках. Каб работа была якаснай і прынесла чаканы вынік, у Савеце Рэспублікі правялі нараду з удзелам прадстаўнікоў МАРГ.

**Вольга АНУФРЫЕВА,**
**фота БелТА.**

# Карысць зваротнай сувязі

## Прамую лінію правёў старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ

**Аб чым былі звароты людзей? Адразу скажам, што не толькі пра недахопы і пралікі ў рабоце камунальных службаў, пра нездавальняльны ход і зацягнутыя тэрміны капітальных рамонтаў жылых дамоў, транспарт і г. д. Прыемным і карысным момантам стаў званок жыхаркі шматкватэрнага дома па вуліцы Навінкоўская, якая выказала словы падзякі Андрэю Бугрову. Яшчэ ў жніўні яна патэлефанавала на прамую лінію старшыні Мінгарсавета дэпутатаў з просьбай пасадзейнічаць навядзенню парадку ў іх двары. Мінуў час, і восень новы званок да старшыні ад той жа жанчыны. Яна з задавальненнем канстатавала, што яе зварот не застаўся без увагі. Дваровай тэрыторыі неўзабаве надалі сучасны выгляд: правялі азеляненне, удасканалілі асвятленне, зрабілі стаянку для ровараў.**

Потым у размове з карэспандэнтам «МС» Андрэй Бугроў згадаў той званок жанчыны. Пасля яго ён і кіраўнік адміністрацыі раёна выехалі на месца, дзе на свае вочы пераканаліся ў неабходнасці навядзення парадку ў двары. Работы былі праведзены ў сцiслыя тэрміны. І вось цяпер паўторны зварот з падзякай.

— Такія званкі гавораць аб важнасці для мясцовай улады, у дадзеным выпадку гарсавета, зваротнай сувязі са сваімі выбаршчыкамі. У гэтым ёсць пэўная ацэнка работы мінскіх дэпутатаў, якая іх матывуе на далейшую плённую дзейнасць на карысць гараджан, — сказаў Андрэй Бугроў.

Шэраг зваротаў мінчан быў прысвечаны ацяпляльнаму сезону. Яны звярталі ўвагу на пэўныя, так бы мовіць, тэмпературныя арэлі пры падачы цяпла ў кватэры. Напрыклад, жыхар дома № 83 на вуліцы Герасіменкі скардзіўся на недахоп цяпла. А вось жыхарка дома № 14/1 на праспекце газеты «Звязда» паведаміла, што яе ў кватэры празмерна цёпла — больш за 30 градусаў! Звароты сур'ёзныя, і ў той жа дзень яны былі накіраваныя для прыняцця мер у адміністрацыі раёнаў сталіцы.

Былі званкі і на іншыя тэмы. Так, адна жанчына папрасіла разабрацца з аплатай камунальных плацяжоў. Бо, на яе погляд, даводзіцца плаціць за паслугі па павышаных тарыфах.

А вось са зваротам іншай неабыякавай жанчыны, якая скардзілася на шум і небяспечныя выхлапы ў скверы імя Прытыцкага ад дызель-генератара, які пастаянна працуе побач, Андрэй Бугроў вырашыў разабрацца з выездам на месца.

На думку старшыні Мінскага гарадскога Савета, людзі тэлефануюць на прамую лінію з надзеяй на дапамогу і падтрымку, і мясцовая ўлада павінна аператыўна рэагаваць на іх звароты.

**Леанід ТУГАРЫН.**

НА ПАРАДКУ ДНЯ

# АД НАСТУПСТВАЎ ПАНДЭМІІ ДА КІБЕРЗЛАЧЫНСТВАЎ

## Парламентарыі абмеркавалі пытанні супрацоўніцтва краін Чарнаморскага рэгіёна

**Беларускія парламентарыі прынялі ўдзел у 58-м пленарным пасяджэнні Генеральнай Асамблеі Парламенцкай асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва (ПАЧЭС), якое адбылося ў рэжыме відэаканферэнцыі.**
**На парадку дня былі 11 пытанняў: ад супрацьдзеяння распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі да паскарэння лічбавізацыі і інавацыйнага развіцця.**

— Парламенцкая асамблея Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва створана ў 1993 годзе, у яе ўваходзіць 12 краін, у тым ліку такія буйныя, як Расія, Украіна, Турцыя, Арменія, Азербайджан, — патлумачыла сутнасць структуры гэтага міжпарламенцкага аб'яднання **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ**, якая ўдзельнічала ў гэтым мерапрыемстве з беларускага боку.

Парламентарый дадала, што, акрамя таго, у гэтую структуру ўваходзяць яшчэ шэсць краін-назіральніц, у тым ліку Беларусь, а таксама 15 міжнародных арганізацый разам з Парламенцкай асамблеяй СНД, Парламенцкім сходам Саюза Беларусі і Расіі і шэрагам іншых інстытуцый.

— Лічу, што міжпарламенцкія арганізацыі займаюць велізарнае месца сярод інстытутаў у сусветнай палітыцы. Голас парламентарыяў чуваць ва ўсіх галінах: у эканоміцы, палітыцы, у міжнародным парадку дня, — падкрэслівае парламентарый.

Акрамя таго, звяртае ўвагу сенатар, на міжпарламенцкіх асамблеях разглядаюцца пытанні ўсіх сфер жыццядзейнасці краін свету. Напрыклад, самым актуальным у цяперашні час з'яўляецца барацьба з распаўсюджваннем COVID-19.

— Парламентарыі разам з міжнароднымі арганізацыямі задумваюцца над тым, як вакцынаваць насельніцтва, колькі павінна быць вакцынавана, каб спыніць пандэмію, — тлумачыць суразмоўніца. — Паводле статыстыкі, сёлета 40 % насельніцтва ўсіх краін свету трэба вакцынаваць, а ў першым паўгоддзі 2022 года лічбу давесці да 60 %.

Яшчэ адной тэмай, якая знаходзіцца ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў ПАЧЭС — барацьба з голадам.

Паводле яе слоў, на пляцоўцы ПАЧЭС парламентарыі абмяркоўваюць таксама тэмы міграцыйнага крызісу, барацьбы з тэрарызмам, кіберзлачынствамі і многія іншыя, якія актуальныя на цяперашнім этапе.

Што датычыцца дадзенага пасяджэння, на парадак дня было вынесена 11 пытанняў.

Разгледжаны шырокі спектр пытанняў гандлёва-эканамічнага, фінансавага, супрацоўніцтва ў сферы адукацыі дзяржаў — членаў арганізацыі ПАЧЭС, а таксама іх узаемадзеянне ў сферы фармацэўтычнай прамысловасці ва ўмовах пандэміі каранавіруса.

— Важная тэма эканамічнага супрацоўніцтва краін Чарнаморскага рэгіёна. Ні для кога не сакрэт, што гэтыя краіны маюць важнае значэнне для эканамічнага развіцця ўсіх краін, у тым ліку Беларусі, — падкрэсліла Таццяна Рунец.

Акрамя таго, былі абмеркаваны пытанні павышэння эфектыўнасці заканадаўчага працэсу, прадстаўнічых парламенцкай дзейнасці ў кантэксце лічбавізацыі і інавацыйнага развіцця.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

ВЫХОЎВАЕМ ГРАМАДЗЯНІНА

# ПРАФЕСІЯ І СЯМ'Я — ПАНЯЦЦІ ТОЕСНЫЯ

**Нехта мудры сказаў, што якім бы паспяховым ні быў у жыцці чалавек, галоўнае — гэта сям'я. І кажу, як не настаўніку, гэта ведаць. Невыпадкова ініцыятарам дыялогавай пляцоўкі «Сям'я — крыніца духоўна-маральнага і прафесійнага развіцця», якая прайшла ў мінскім Храме-помніку Усіх Святых і ў памяць ахвяр, якія выратаванню Айчыны паслужылі, стаў менавіта Мінскі гарадскі педкаледж. У абмеркаванні надзённых пытанняў прыняла ўдзел і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Вольга Петрашова. Яна, дарэчы, у мінулым — выпускніца гэтага каледжа.**

— Тэма была настолькі актуальная, што сустрэча расцягнулася на чатыры гадзіны, — паведаміла Вольга Петрашова. — Навучэнцаў цікавіла, што прынцыпова новага з'явілася ў праекце Кодэкса аб адукацыі. Мы размаўлялі на тэму маральнага выхавання, фарміравання сямейных каштоўнасцяў, сацыяльнай падтрымкі моладзі. Гэта і прэзідэнцкія стыпендыі для таленавітай моладзі, і стварэнне інклюзіўных умоў для асаблівых дзяцей, і нават магчымасць вучыцца ў прафесійна-тэхнічных каледжах і атрымліваць прафесію. Мала ў якіх краінах засталіся такія ўстановы. І гэта таксама клопат нашай дзяржавы пра моладзь.

На сустрэчы шмат казалі пра падтрымку шматдзетных сем'яў, людзей з інваліднасцю, пра гарантыі і льготы грамадзян, у тым ліку дзяцей. У размове прымалі ўдзел клірык храма Усіх Святых Сяргей Яўтушык і настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 123 Юлія Казлоўская. Дыялогавая пляцоўка прайшла ў рамках конкурсу прафесійнага майстэрства «Выхаванне ў асобах» (намінацыя «Педагог арганізатар»).



Падсумоўваючы вялікую размову пра сям'ю і выхаванне, арганізатары падкрэслілі: тэма, якую закранулі падчас дыялогавай пляцоўкі, настолькі ўсёабдымная, што не можа быць завершана. Як працяг яе можа стаць удзел у акцыі «#ПраваНаРадасць», што педкаледж праводзіць з мэтай дапамагчы дзецям, якія трапілі ў цяжкае сацыяльнае становішча.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Вольгі ПЕТРАШОВАЙ.**

# ВЯЗЫНСКІЯ КАМУНАРЫ

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на 7-й стар.)***

Пілотны праект пад назвай «Сезонны дом» таму і лічыцца спачатку пілотным, бо праводзіўся ў раёне ўпершыню. І трэба было ў рэальных умовах звычайнай вясковай тэрыторыі пераканацца ў яго жыццяздольнасці, бо эфектыўнасць ідэі магла пацвердзіць толькі практыка. І яна пацвердзіла: сезонны дом пад пільным наглядам **старшыні Вязынскага сельскага Савета Ігара СУДНІКОВІЧА** прыжыўся. Гэта ідэя яму адразу здалася цікавай і карыснай. Хоць былі моманты, як сам ён прызнаецца, калі яму не асабліва верылася ў станоўчы вынік. Сумнявацца прымушалі асаблівасці псіхалогіі вясковых людзей. Ён ведаў, як, з аднаго боку, няпроста жыць у маленькіх вёсачках адзінокім старым, а з іншага — як невыносна ім пакінуць хоць і часова мілы родны кут. Яны лічылі, што няхай і з цяжкасцямі, але ўсё ж дома жыць лепш. Іх можна зразумець. Пастаянна жыць больш за 80 гадоў на адным месцы ўвесь час у сваім доме і раптам з'ехаць...

Тым не менш невялікай групе сталых жыхароў сельскага Савета зрабілі прапанову, ад якой пры яе аб'ектыўным разглядзе ім цяжка было адмовіцца. А дакладней, на зімовы перыяд пераехаць у сезонны дом і жыць там сумесна з яшчэ некалькімі вяскоўцамі прыкладна такога ж узросту. І галоўнае — у любы момант можна вярнуцца дадому.

Трэба адзначыць, што тады 10 гадоў назад, на этапе станаўлення, ідэя сезоннага дома атрымала адчувальную падтрымку з боку тагачасных **старшыні райсавета дэпутатаў Яўгена Ігнатовіча, дырэктара Вілейскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Людмілы СЛЯПЦОВАЙ.** Сёння яна, дарэчы, дэпутат райсавета і актыўна садзейнічае рэалізацыі іншых сацыяльных праектаў у раёне. Шмат увагі пераТварэнню былога, па сутнасці, офіснага будынка ў жыллё для пенсіянераў надалі дэпутаты Вязынскага сельсавета.

## Разам не засумуеш

У сезонным доме жывуць на прынцыпах камуны. Насельнікі дома на перыяд знаходжання ў складчыну частку пенсій ахвяруюць на сацыяльныя і камунальныя паслугі, набыццё прадуктаў харчавання, дроў, іншыя выдаткі. Заўважце, пражыванне ў доме бясплатнае. Як і забеспячэнне камплектамі пасцельнай бялізны, яе мыццё ў пральні. Сёлета тут плануецца ўладкаваць стацыянарную пральную машыну, якой кіраваць будзе сацыяльны работнік. Дробныя рамонты плота, тэлевізара, падтрыманне парадку вакол дома, скажам, траву скасіць, іншыя бытавыя клопаты бярэ на сябе сельсавет, як і трансфер, кажучы па-сучаснаму, насельнікаў ад сезоннага дома і дамоў у вёску пасля зімы.



Сацыяльная дача ўлетку.

Не сказаць, што жыццё віруе ў гэтым доме, але тое, што людзі моцна не сумуюць тут, дык гэта факт. Каб яны не заставаліся сам-насам з цяжкімі думкамі, не адчувалі сабе кінутымі, іх рэгулярна наведваюць валанцёры з ліку тутэйшых жыхароў. У святочныя дні работнікі мясцовага Дома культуры разам з прадстаўнікамі мясцовай школы ладзяць невялічкія імпрэзы і канцэрты, што моцна ўздымае настрой і, натуральна, самаадчуванне камунараў. **Дырэктар Дома культуры Наталля ЧАРТОК**, яна ж і дэпутат сельсавета, завадатар шэфскай работы з сезонным домам. Паводле слоў Ігара Судніковіча, трымае з яго насельнікамі пастаянную сувязь. А дэпутат райсавета Рыгор Кулеш, ён жа работнік Вілейскага доследнага лясгаса Вязынскага лясніцтва, сочыць за тым, каб дом своечасова забяспечваўся дровамі.

## А ўлетку «Сацыяльная дача»

З часам цікавы працяг і развіццё атрымала ідэя сезоннага дома. Праз некалькі гадоў на яго базе пачалі рэалізоўваць новы праект пад назвай «Сацыяльная дача». Каб улетку дом не прастойваў зачыненым, вырашылі там на летні сезон за пэўную плату сяліць на два-тры тыдні сталых людзей з інваліднасцю для аздараўлення і змены звыклай хатняй абстаноўкі, што таксама карысна ўплывае на самаадчуванне, бо мясціны вакол і прыгожыя і экалагічна чыстыя: возера, лес.

— Гэта дача неабавязкова толькі для патрэб насельнікаў Вязынскага сельсавета. Тут ужо правялі частку лета жыхары з Маладзечна, Полацка, Мінска і іншых гарадоў. І такіх адпачывальнікаў на прыродзе ўжо не адзін дзясятак, гаворыць **дырэктар Вілейскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» Вольга БУСЛАЎСКАЯ.**

> Сёння вялікая сумесная работа з дэпутатамі сельсаветаў вядзецца па вакцынацыі сталых людзей. Іх наведваюць, пераконваюць у карысці прышчэпак. І людзі прыслухоўваюцца, ідуць насустрач свайму здароўю і медыкам, — кажа Вольга Буслаўская.

Паводле яе слоў, у раёне, на жаль, назіраецца старэнне насельніцтва. Сёння ўжо 29 працэнтаў яго жыхароў — пенсіянеры. Для параўнання: у Мінскай вобласці гэты паказчык складае 15 працэнтаў. Узрастае нагрузка на сацыяльную службу раёна. Не хапае сацыяльных работнікаў. Асабліва складана абслугоўваць адзінокіх жыхароў маленькіх аддаленых вёсак. Таму работнікі цэнтра імкнуцца выкарыстоўваць розныя формы сацыяльных паслуг. Добра, напрыклад, сябе зарэкамендавалі мабільныя брыгады. Яны дазваляюць цэнтру пастаянна быць у курсе спраў іх падапечных, аператыўна рэагаваць на іх праблемы. Сёння працуюць дзве такія брыгады. Цяпер плануецца арганізаваць яшчэ адну.

Дапамагае супрацоўнікам цэнтра цеснае ўзаемадзеянне з мясцовай уладай на вёсцы. Бо без сельскіх Саветаў, без іх непасрэднага ўдзелу і дапамогі ў вырашэнні розных праблем пенсіянераў ніяк не абысціся. Кантакт з Саветамі ідзе ў пастаянным рэжыме, напрыклад, у такой важнай узімку для бяспекі сталых людзей справе, як рамонт грубкі. Ён, дарэчы, праводзіцца за кошт цэнтра. З кожным сельсаветам удакладняюцца адрасы такіх хацін.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**
**Фота з архіва Вілейскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 25 лістапада 2021 года.**

# «ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ ЎСЕ СПЯЦЬ, А ГЭТЫ ПСІХ ЛАЗІЦЬ НОЧЧУ ПА СКАЛАХ»

## Пяць анкет Уладзіміра Караткевіча

**26 лістапада. Дзень нараджэння нашага любімага Уладзіміра Сымонавіча Караткевіча... Чалавека, які адкрыў нам новую гістарычную Беларусь — рыцарскую, шляхецкую, інсургенцкую, гераічную... Пісьменніка, чые кнігі дасюль узначальваюць рэйтынгі папулярнасці.**

Што больш яскрава дапаможа ўявіць вялікага чалавека, чым ягоныя ўласныя прызнанні? У 13-м томе Збору твораў Уладзіміра Караткевіча ў 25-ці тамах, які цяпер выходзіць у выдавецтве «Мастацкая літаратура», апублікаваныя ягоныя анкеты... Давайце перачытаем іх і даведаемся незвычайныя факты.

### 1. Знікла аповесць пра Неферціці

Так званая малая аўтабіяграфія («Дарога, якую прайшоў»), захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва ў фондзе Янкі Казекі. Яна напісаная 1 снежня 1964 года для кнігі пісьменніцкіх аўтабіяграфій «Пра час і пра сябе», укладальнікам якой быў Казека.

Уладзімір Караткевіч успамінае час, калі ў 1944-м пасля пакутлівых блуканняў, эвакуацыі вярнуўся на Беларусь і давучваўся ў школе.

*«Многіх з нас цягнула да вершаў. Стольких, што мы нават выдалі некалькі нумароў рукапіснага часопіса «Званочак».*

*Чамусьці вершы былі патрэбней за многае. А пісаліся ж пры святле гільзы на нямецкіх бланках ці на звароце доўгіх жоўтых канвертаў, таксама нямецкіх. Аддавалі перавагу канвертам, з-за добрай паперы».*

Караткевіч тады напісаў не менш за дзвесце вершаў, але нікому іх не паказваў. Пакуль не прыйшла новая настаўніца па прозвішчы Грыневіч. Вось нерак так атрымалася, што Валодзя ёй вершы і паказаў...

*«Яны і прыгодніцкая аповесць «Загадка Неферціці» былі «надрукаваныя» ў нашым «Званочку». І гэта была адзіная мая «публікацыя» за дзесяць год. Цяпер усё гэта недзе згубілася, і шкадаваць аб гэтым, пэўна, няма чаго».*

Караткевіч мо, і не шкадаваў, а вось мы, ягоныя адданыя чытачы, вядома, шкадуем... Знайсці б цяпер той «Званочак», прачытаць аповесць «Загадка Неферціці»!

### 2. Лічыў сябе Дон Кіхотам і Кала Бруньёнам

Сябар Уладзіміра Караткевіча Юрый Гальперын у 1957-м даслаў яму анкету. Караткевіч працаваў тады настаўнікам у Оршы. Але адказы на пытанні, якія, дарэчы, былі надрукаваныя толькі ў 2015 годзе, уражваюць. Напрыклад, з любімых замежных паэтаў Караткевіч згадвае «Данте, Гейне — странная пара», з драматургаў — Сафокла, з празаікаў — Ралана і Сервантэса, з сучасных — Паўстоўскага і Коласа.

Музыку Караткевіч любіў класічную, «эстрадную, в общем, на 90 % терпеть не могу». Любімыя кампазітары — Бетховен, Чайкоўскі, Мусаргскі, любімыя музычныя творы — «V і IX Бетховена, «Франческа да Римини» Чайковского». З песень Караткевіч назваў цыкл «Зімні шлях» Шуберта і песні Бетховена. Любімыя артысты — Шаляпін, Святаслаў Рыхтэр, Натан Рахлін. Мастакі — «из белорусов — Ковальский. Из поляков — Матейко и циклы Гротера. Из западных — Рембрандт». Архітэктары — «Кажется, мог бы полюбить Иктина, если бы видел не только по фотографиям в альбомах. Люблю Баженова, но не во всем».

Прадказальны адказ наконт краін, якія больш за ўсё цікавяць, — «Прежде всего и навеки Беларусь». Вось далей троху нечакана: «Потом Индия, Италия, острова южных морей».

Звернем увагу на пытанне пра ўпадабаных літаратурных герояў: *«Дон Кихот, Кола Брюньон, все, на кого валятся шишки и которые побеждают (даже в смерти)».*

Безумоўна, гэтак Караткевіч казаў і пра сябе.

### 3. Ненавідзеў «накапіцельства»

Караткевіч нібы прадбачыў сённяшнюю маскультуру спажывальніцтва з прынцыпам геданізму — жыць для сябе. 11 снежня 1976 года ў Дубултах — нават пазначыў дакладны час, 21.42 — ён адказаў на пытанні Алега Бембеля пра нацыянальнае і інтэрнацыянальнае... Тут шмат разважанняў пра беларускую гісторыю, культуру і нацыянальны характар, тым больш Караткевіч на той момант падрыхтаваў сваю кнігу «Зямля пад белымі крыламі». На пытанне пра страты, якія панесла чалавецтва падчас Другой сусветнай вайны, акрамя мільёнаў жыццяў і рэчыўных каштоўнасцяў, Караткевіч разважае так:

*«Што тычыцца душ людскіх, то тут страты ідуць за кошт яшчэ жывых, але траўміраваных, за кошт той невялікай у працэнтах, але досыць вялікай колькасна часткі, якія вырашылі што «жыццё кароткае», а таму адарваліся ад іншых, зашыліся ў свае маленькія «версалі», якіх нічога не цікавіць, акрамя «накапіцельства», кішэні, калекцый, вілаў.*

*Такім глыбока пляваць на чалавека побач, на ўсё чалавецтва, на родную мову, на родны народ».*

Караткевіч робіць рэзкую высновy:



АНКЕТА

1. Какие отрасли человеческой культуры Вас интересуют больше всего/наука, техника, искусство/? *Интересуют все, техника немного меньше, литература и искусство — всепоглощающе.*
2. Ваши любимые писатели /поэты, прозаики, драматурги; иностранные, русские; классики, современные/ *Поэты — Пушкин, М. Богданович; прозаики — Лев Толстой, Достоевский; драматурги — Софокл. Из иностранных поэт — Данте, Гейне (странная пара). Прозаики — Роллан, Сервантес. Современные — Паустовский, Колас*
3. Ваши любимые литературные произведения *Всё по-настоящему человечное*
4. Ваши любимые литературные герои *Дон Кихот, Кола Брюньон, все, на кого валятся шишки и которые побеждают (даже в смерти).*
5. Какую музыку Вы больше любите – классическую или легкую? симфоническую, камерную, оперную, балетную, эстрадную и т.д. *классическую во всех видах, эстрадную в общем на 90 % терпеть не могу.*
6. Ваши любимые композиторы *Бетховен, Чайковский, Мусоргский*
7. Ваши любимые музыкальные произведения:
а/симфонии, симфонические поэмы, фантазии, увертюры *V и IX Бетховена, «Франческа да Римини» Чайковского.*
б/камерные инструментальные произведения *Трио «Памяти великого артиста».*
в/оперы, балеты и отдельные фрагменты из них *«Пиковая дама», «Царская невеста» (интимно), «Борис Годунов»*
г/романсы *Нравятся в большинстве. Глинку люблю в романсах, Мусоргского.*
д/песни *Цикл «Зимний путь» Шуберта. Песни Бетховена, народные песни белорусские, русские и [illegible]*
е/оперетты *терпеть не могу кроме [illegible]*
8. Ваши любимые артисты – певцы, музыканты-исполнители, дирижеры, артисты балета, театры и коллективы *Шаляпин, Святослав Рихтер, Натан Рахлин. Оперные театры Москвы, Киева и Минска знаю, в общем, плохо, чтоб судить.*
9. Ваши любимые драматические театры, режиссеры, актеры, спектакли и роли *Минский театр им. Янки Купалы, Киевский им. Леси Украинки, в Москве малый театр больше, чем МХАТ (МХАТ мало знаю). Артисты: Глебов, Романов (Киев) — в роли Протасова «Живой труп». Мало могу. Об этом надо писать [illegible]*
10. Ваши любимые кинофильмы, режиссеры, операторы, артисты и герои фильмов *«Мы из Кронштадта» (чудесный), «Мусоргский», «Тарас Шевченко». Многое и трудно сразу вспомнить. Ну и «Сестры» хорошо, «Трилогия о Максиме». Очень люблю итальянские фильмы. Нашу белорусскую [illegible] ещё надо создавать.*
11. Ваши любимые артисты эстрады, цирка и чтецы
12. Ваши любимые художники и их произведения *В русской живописи — Левитан, Репин — все. [illegible] Из белорусов — Ковальский. Из поляков — Матейко и циклы Гротера. Из западных — Рембрандт.*
13. Ваши любимые скульпторы и их произведения *Древние греки, М. Антокольский. Новой скульптуры за малым исключением не люблю.*
14. Ваши любимые архитекторы и произведения архитектуры *Кажется, мог бы полюбить Иктина, если бы видел не только по фотографиям в альбомах. Люблю Баженова, но не во всем.*
15. Какие области науки и техники и научные проблемы Вас интересуют? *археология, история, зоология, ботаника, лингвистика.*
16. Какие эпохи Вас больше всего интересуют в мировой истории и в истории нашей страны *Древний Египет, Рим (личность его — очень люблю [illegible]). История Франции — вся. Белорусская история — XVI–XVIII вв. [illegible], история [illegible] городов. В общем, вся история Белоруссии. В русской истории — Смутное время, Разин, Пётр I.*



*«Яны прыпаўзлі, яны і адпаўзуць, як чэрві.*

*А чалавек, чалавецтва, культура, мова, нацыя жылі і будуць жыць вечна».*

### 4. Цаніў адсутнасць «катурнаў»

Праз дзесяць дзён у тым жа доме творчасці Дубулты, 22 снежня 1976 года, Караткевіч дае «доўгі адказ на тры кароткія пытанні». На жаль, не пазначана, хто менавіта даслаў тыя пытанні. Калі на апошнія два — «Як вы ўяўляеце шчасце?» і «Якія змены адбыліся з вамі за апошні год?», Караткевіч адказвае парай абцякальных сказаў, то на першае — «Якія якасці падабаюцца вам у людзях, што вас акружаюць?», дае развагі на некалькі старонак.

*«Нельга жыць без любові або павагі навакольных да цябе. І гэты прынцып, якому столькі ж год, колькі чалавецтву, але якому раней следавалі адзінкі, — цяпер прынцып многіх і многіх тысяч. І ён вельмі просты: салдат ты або генерал — жыві так, як твае суседзі-салдаты. Спі з імі на пяску ці снезе, прыйдзе такое, — галадай з імі, дзяліся апошнім. А калі будзе добра, то і напіся разам з імі. Яны прабачаць, бо й самі не лепшыя. І ніколі не судзі аб сваім салдаце, генерале, пэце па тым, як аб ім кажуць.*

*Ён не мае «камандзірскага голасу», але ён 36 гадзін, самотны, стрымлівае 22 чэрвеня пераправу немцаў цераз Буг (прыклад В. С. Рудава, які раскапаў гэтую гісторыю). Ён, сучаснік, можа быць балбатун і ўзвейвецер, але, магчыма, толькі ў яго знойдуцца сапраўдныя радкі на час вялікай бяды.*

*Цярпімасць — вось што галоўнае. Пры мужнасці і адданасці».*

### 5. Лазіў ноччу па скалах

У 1979 годзе Караткевіч атрымаў ліст ад старшага выкладчыка кафедры беларускай літаратуры БДУ Тацяны Шамякінай з просьбай даць адказы на пытанні невялікай анкеты, каб выкарыстаць для работы са студэнтамі. Пісьменнік не прамарудзіў, быў, як заўсёды, шчыры і іранічны.

*«Ну і рос, як усе. З іхняй бясконцай цікавасцю да ўсіх з'яў і праяў жыцця. З прынцыпам, які і цяпер ува мне не выветрыўся: «гэта цікава, а значыць, і павінен гэта ведаць» (не датычыцца асабістых сакрэтаў людзей: гэтым у нас усе грэбавалі), «нехта ўмее — значыць, магу і я».*

*Нехта плавае, скача ў ваду, ловіць змей дзеля яду, баброў, умее лазіць па скалах — значыць, і я магу. І павінен гэта рабіць добра, бо дрэнна нешта рабіць сорамна».*

У наступных адказах Караткевіч пацвярджае гэты прынцып.

*«І на маім шляху егеры, змеяловы, чабаны, начлег на Марыяцкай вежы ў Кракаве, скалалазы, ганчары, свяшчэннікі, народныя майстры скрыпак, следчыя і г. д.*

*...Сцэна ў кактэбельскай міліцыі. Пагранічнікі затрымалі. Маёр: «Каго затрымалі? Мы яго шмат год ведаем. Добрыя людзі ўсе спяць, а гэты псіх лазіць ноччу па скалах». Мне гэтыя словы — самая дарагая ўзнагарода».*

І каб зрабіць падарунак пісьменніку ў дзень яго нараджэння — перачытайце ягоныя творы.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

---

Каб помнілі

# СТАРШЫНЯ КАЛГАСА

## Пайшоў з жыцця вядомы на Брэстчыне аграрый Леанід Лявонаў



